Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 МАЯ 2015 г. АЎТОРАК № 82 (27940) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У РЭЧЫШЧЫ СУСВЕТНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям XIX Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

Гэтае мерапрыемства з'яўляецца яркай і маштабнай падзеяй у жыцці медыйнай суполкі, своеасаблівым прафесійным і творчым экзаменам для прадстаўнікоў журналісцкага корпуса, гаворыцца ў прывітанні.

Сімвалічна, што сёлета выстава праходзіць напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Бессмяротны подзвіг пакалення пераможцаў знайшоў адлюстраванне і ў экспазіцыях выстаўкі. Яе наведвальнікі змогуць убачыць фотаработы і выданні часоў Вялікай Айчыннай вайны з архіваў рэдакцый і фондаў бібліятэк», — адзначыў Прэзідэнт.

«Сёння беларускія СМІ развіваюцца ў рэчышчы сусветных тэндэнцый, актыўна ўкараняюць найноўшыя камунікацыйныя тэхналогіі. Далейшаму ўдасканальванню айчыннай прэсы пасадзейнічаюць розныя форумы і дыскусіі, запланаваныя ў рамках мерапрыемства», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Статыстыка за першы квартал 2015 года, калі яе скарыстаць у дачыненні да ўсяго года, дае ўзровень інфляцыі прыкладна ў 16%. Арыенціровачна мы вызначыліся, што ён можа быць дзесьці 18% — плюс-мінус два працэнтныя пункты, пры гэтым ніжняя мяжа ўзроўню будзе роўная, па нашых прагнозах, 15%. Зніжэнне інфляцыі — вельмі важная макраэканамічная задача. Мала зарабіць добрыя даходы — важна забяспечыць іх захаванасць. Менавіта ў захаванасці пакупніцкай здольнасці насельніцтва — задача зніжэння інфляцыі. Гэта неабходна і для забеспячэння доўгатэрміновага збалансаванага эканамічнага росту».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14300,00 | ▼ |
| Еўра | 15960,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 672,94 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

**■ Мы памятаем!**

# Героі ў сталічным небе




**Штогадовы конкурс паветраных змеяў «ТэхнаЭнергія», што праводзіцца Рэспубліканскім цэнтрам інавацыйнай і тэхнічнай творчасці, ужо традыцыйна прымеркаваны да Дня Перамогі. У спаборніцтве прынялі ўдзел больш як 40 змеяў, кожны з якіх «узляцеў» у гонар пэўнага беларуса — Героя Савецкага Саюза. У сталічнае неба непадалёк ад сядзібы Ваньковічаў узняліся папяровыя, тканінныя, поліэтыленавыя лятальныя апараты, створаныя моладдзю з усіх куткоў Беларусі. На мерапрыемстве пабывалі і карэспандэнты «Звязды».** СТАР. 3

Фота Надзеі БУЖАН.

**■ Надвор'е**

# Дажджы, магчымыя навальніцы

## А ў сераду і чацвер прагназуецца яшчэ і моцны вецер

**У аўторак на тэрыторыю нашай краіны будзе ўплываць малаактыўны атмасферны фронт, таму ў асобных раёнах пройдзе невялікі дождж. Удзень магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе 15-21 цяпла. Пра гэта паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Ужо ў сераду да нас завітае атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы. Уначы месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, а ўдзень — у заходніх рэгіёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі дажджы моцныя. У асобных раёнах на захадзе — навальніцы і ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе ад плюс 4 градусаў па паўночным усходзе, да 14 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 17-23 градусы, на поўдні краіны — да 26 цяпла. У чацвер сур'ёзныя дажджы будуць гаспадарыць ужо паўсюдна. Месцамі чакаюцца моцныя ліўні і навальніцы, пры якіх вецер будзе дасягаць 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе плюс 6-12 градусаў, удзень — 11-18 цяпла, на поўдні краіны — да плюс 20 градусаў. Аднак напрыканцы тыдня зноў будзе халаднавата.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу часам чакаюцца кароткачасовыя ападкі, а месцамі яшчэ і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу складзе 4-11 цяпла, удзень — толькі плюс 10-17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Вясной прыходзіць пацяпленне

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка размічвае, што Захад зробіць шэраг крокаў адносна Беларусі ў правільным напрамку. Пра гэта ён заявіў на сустрэчы з федэральным міністрам па пытаннях Еўропы, інтэграцыі і замежных спраў Аўстрыі Себасцьянам Курцам, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў сённяшні ўзровень адносін з Захадам як некаторае пацяпленне.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў пачатку свайго прэзідэнцтва, аналізуючы ўзаемаадносіны Беларусі з заходнімі дзяржавамі, прыйшоў да высновы, што Захад размеркаваў рэспубліцы былога Савецкага Саюза і замацаваў за імі сваіх адказных і ў зону адказнасці Аўстрыі ўвайшла Беларусь. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што Беларусь кантактавала з Аўстрыяй больш, чым з іншымі краінамі. Аўстрыя інвесціравала ў Беларусь вельмі многае, прыўносячы самыя перадавыя тэхналогіі. «Я абсалютна не быў супраць таго, каб устанавіць найбольш цесныя адносіны з Аўстрыяй. Вельмі вялікую цікавасць выказвала да супрацоўніцтва з Беларуссю Германія. Я з гэтым згадзіўся», — сказаў беларускі лідар. У той жа час ён нагадаў, што пасля Захад вырашыў крыху памяняць тактыку і стратэгію адносна Беларусі. «У нас не было іншага выйсця, як прыняць такую пазіцыю», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Я лічу, што ваш візіт будзе значным, — сказаў Прэзідэнт. — Ваш прыезд — гэта добры знак».

Гаворачы пра двухбаковыя адносіны, Аляксандр Лукашэнка выказаў задавальненне цяперашнім узроўнем супрацоўніцтва Беларусі і Аўстрыі. Паводле яго слоў, за 2014 год аўстрыйскі бок інвесціраваў у эканоміку Беларусі больш як $500 млн. У той жа час ён заўважыў, што ў найлепшыя гады гэтая лічба даходзіла і да $900 млн. «Я вельмі размічваю, што пасля вашага візіту будуць больш маштабныя захады па пашырэнні нашага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Прэзідэнт.

# ІСЦІ АД ЗЯМЛІ

## У развіццё вёскі за апошнія дзесяць гадоў краіна ўклала больш за $45 млрд

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, знаёмячыся з ходам веснавых палявых работ у Магілёўскай вобласці, наведаў аграгарадок «Александрыя» Шклоўскага раёна, дзе, сярод іншага, сустрэўся з фермерамі.**

Паводле слоў беларускага лідара, ён, з аднаго боку, даўно рыхтаваўся да гэтай сустрэчы. З іншага боку, яна своеасаблівая і незвычайная — у раён не пасылалі спецыялістаў, каб вывучыць сітуацыю. «Я хацеў на роднай зямлі сустрэцца з людзьмі, якіх ведаю, якія працуюць на зямлі, размічваючы на іх шчырасць у бачанні праблем і перспектыў далейшага развіцця вёскі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі нагадаў, з чаго пачыналася яшчэ зусім нядаўна развіццё аграрнага сектара. Не хапала сродкаў, адчуваўся недахоп сельгаспрадукцыі. Накарміць, як аказалася затым, народ можна, як і прадаць прыстойную колькасць прадукцыі. А сёння Беларусь імкнецца выйсці на экспарт $7 млрд сельгаспрадукцыі. Забяспечана харчовая бяспека краіны. А тады стаяла пытанне: «Што рабіць?» Было шмат розных прапаноў. У тым ліку адна з прапаноў — раздаць зямлю ў прыватную ўласнасць. «Вы ведаеце маё рашэнне. Я быў катэгарычна супраць. І пабываўшы сёння ў паспяховых фермераў Шклоўскага раёна, у людзей, з якімі я працаваў, якіх я добра ведаю, пераканаўся, што тады мы абсалютна правільна паступілі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, калі б тады раздалі зямлю, то сёння б мелі цяжкія наступствы. Шмат негатыўных момантаў «прыватызацыі» ён сёння бачыць у суседняй Расіі і нават Еўропе. Паводле слоў Прэзідэнта, сёння нават еўрапейскія госці зайздросцяць беларускім аграрыям, паколькі там далёка не ўсе фермеры могуць дазволіць сабе працаваць на такіх вялікіх плошчах зямлі. Там вельмі жорсткая канкурэнцыя, а зямля прыватная. І кожны прыватнік змагаецца за сваю зямлю, імкнучыся атрымаць са свайго шматка максімум выгады. «Напэўна, тады мы прынялі правільнае рашэнне, і я не думаю, што ад яго трэба адмаўляцца, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Тады ж мною было прынята рашэнне не перашкаджаць развіццю фермерскага руху. І калі яшчэ некалькі гадоў таму былі абмежаванні на карыстанне зямлёй, то сёння яны зняты. Важным крокам у развіцці вёскі Прэзідэнт таксама лічыць тое, што ў Беларусі быў створаны цэлы шэраг сельскагаспадарчай тэхнікі ад шырокай лінейкі трактароў, навясных агрэгатаў да камбайнаў. «Пытанне якасці застаецца сур'ёзным, — заўважыў ён. — Але на гэта мы сёння звяртаем асаблівую ўвагу. Тым не менш, наша тэхніка, і гэта паказвае практыка, можа працаваць эфектыўна. Для гэтага толькі патрэбныя веды і ўменні».

Прэзідэнт даручыў ураду таксама разгледзець і вырашыць праблемы ўласнасці для фермераў. «Гэта не той выпадак, дзе дзяржава павінна трымацца за гэтую ўласнасць, напрыклад, стары свінакомплекс, які быў бы даўно ўжо разбураны. Я думаю, нам трэба прадумаць, сабраць разам усе праблемныя пытанні фермерскай супольнасці, звязаныя з уласнасцю, і адным махам іх вырашыць», — даручыў Аляксандр Лукашэнка. «Таму давайце ад жыцця пойдзем і вырашым гэтае пытанне. Але трэба ўлічваць, што ў пытанні прыватнай уласнасці мы яшчэ толькі ў пачатку шляху. І нам трэба вельмі асцярожна ісці, улічваючы меркаванне грамадства», — лічыць Прэзідэнт.

Што тычыцца пытання прыватнай уласнасці на зямлю, то, на думку Прэзідэнта, у Беларусі час для яе ўстанаўлення яшчэ не прыйшоў.

# СЯБРАВАЦЬ У ІМЯ НАРОДАЎ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора даў інтэрв'ю сродкам масавай інфармацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі — Цэнтральнаму тэлебачанню Кітая і інфармацыйнаму агенцтву «Сіньхуа», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт падзяліўся бачаннем будучыні беларуска-кітайскіх адносін у кантэксце маючага адбыцца візіту ў Беларусь Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

«Нашы дружба і супрацоўніцтва правераны двума дзесяцігоддзямі мінімум, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — І, я думаю, кітайскае кіраўніцтва і кітайская дзяржава пераканаліся, што Беларусь — гэта салідны і сур'ёзны партнёр».

«Кітаю патрэбна дружалюбная краіна ў Еўропе. Калі ласка, размічвайце на нашы магчымасці ў цэнтры Еўропы, давайце будзем супрацоўнічаць на карысць адзін аднаму», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, Старшыня КНР віtae такі падыход. «Больш за тое, кітайцы — вельмі асцярожныя людзі, яны ніколі не будуць супрацоўнічаць з праблемнымі дзяржавамі. Яны не жадаюць лезці туды, дзе праблемы», — адзначыў беларускі лідар. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі няма праблем ні з кім, і кітайскі бок гэта цэніць.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу, што Беларусь заўсёды падтрымлівала дружалюбныя адносіны з Кітаем. «І мне падабаецца гэты падыход кітайскага кіраўніцтва. Гэта, у прынцыпе, наш падыход. Мы нікому не павінны ствараць праблем. Мы ідзём не супраць кагосьці, не сябруем супраць некага, мы сябруем у імя нашых народаў. Гэта таксама нікому праблем не стварае», — адзначыў Прэзідэнт.

«Таму ў нас ёсць вялікі Кітай, у Кітая ёсць вельмі дружалюбная краіна ў цэнтры Еўропы», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама адказаў на шэраг пытанняў, што датычыліся сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, урачыстых мерапрыемстваў у Беларусі і Кітаі з нагоды заканчэння Другой сусветнай вайны, некаторых актуальных міжнародных праблем, перспектыў беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы.

# ДОБРАСУСЕДСТВА — ПРАЗ ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ

**Заўтра распачынаецца візіт Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна ў краіны Еўразійскага эканамічнага саюза. Кіраўнік найбуйнейшай дзяржавы ў свеце правядзе перамовы з прэзідэнтамі Казахстана, Расіі і Беларусі, прыме ўдзел у святкаванні 70-годдзя Вялікай Перамогі ў розных краінах.**

Пра гэта на сустрэчы з беларускімі журналістамі ў Пекіне расказаў намеснік міністра замежных спраў КНР спадар Чэн Гапін. Кітайскі дыпламат адзначыў высокі ўзровень сённяшніх беларуска-кітайскіх адносін. Звярнуў увагу на тое, што зараз трывалым падмуркам іх станаўлення і развіцця з'яўляюцца міждзяржаўныя пагадненні, памкненні лідараў нашых краін да стварэння атмасферы добрасуседства, нягледзячы на тысячы кіламетраў адлегласці паміж Кітаем і Беларуссю. Як выразную праяву скіраванасці і шырыні інтарэсаў у зносінах намеснік міністра назваў і наступны факт: з 1 мая здзяйсняецца прамы авіяцыйны рэйс паміж Мінскам і Пекінам. «Гэта паспрыяе таму, што ў Кітай і адпаведна ў Беларусь пачнецца больш маштабны рух простых людзей, простых грамадзян», — адзначыў спадар Чэн Гапін. А гэта яскрава выразна падкрэслівае шчырасць і сапраўднасць зносін, калі значнае месца ў стасунках займае народная дыпламатыя. Носьбітамі такой дыпламатыі намеснік міністра назваў журналістаў, выказаўшы спадзяванне, што праз іх выступленні ў СМІ чытачы, гледачы адкрыюць для сябе невядомы ці малавядомы ім раней свет, убачаць перспектывы прагрэсу ў міралюбівых, прыязных адна да адной краінах. На сустрэчы ў МЗС Кітая прадстаўнікі беларускіх масмедыя ўручылі гаспадарам кнігі «Беларусь вачыма кітайцаў» і «Кітай вачыма беларусаў». Абедзве пабачылі свет у Беларусі — у Выдавецкім доме «Звязда» і БЕЛТА — і займелі шырокі розгалас у нашай краіне.

Візіт кіраўніка Кітая ў Беларусь, яго перамовы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, знаёмства з сумеснымі беларуска-кітайскімі праектамі, несумненна, яшчэ палепшаць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем.

**Кірыл ЛАДУЦЬКА,**
*г. Пекін.*

# Медыяпрастора запрашае

## Сёння ў сталіцы распачынае працу XIX Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі»

**Як адзначыла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, роля медыя ў развіцці сучаснага грамадства, міждзяржаўных камунікацый істотна ўзрастае. Таму вельмі важна, каб нацыянальная інфармацыйная прастора працавала стваральна, адлюстроўваючы ўсе тыя з'явы і падзеі, якія адбываюцца ў краіне, каб забяспечвала канстытуцыйныя правы нашых грамадзян на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі, спрыяла развіццю суверэннай Беларусі. Адна з прыярытэтных тэм у найбліжэйшы час — гэта 70-годдзе Вялікай Перамогі, яна і стане лейт-матывам выставы СМІ.**

На пачатак мая ў нашай краіне прыпадае і яшчэ некалькі свят: 5 мая — адзначаецца Дзень друку, які ўсе супрацоўнікі газет і часопісаў лічаць сваім прафесійным святам, 7 мая — Дзень радыё, тэлебачання і сувязі. Акурат у гэтыя дні, з 5 па 7 мая, будзе праходзіць выстава «СМІ ў Беларусі». Таму ёсць магчымасць не толькі завочна павіншаваць сваіх любімых журналістаў, але і асабіста сустрэцца з імі падчас шматлікіх прэзентацый, аўтограф-сесій, дыскусій.

Сёння ў 12.00 адбудзецца ўрачыстае адкрыццё выставы, на якое завітаюць высокія госці, прадстаўнікі айчыннай медыясферы. А праз кароткі час, у 13.30, варта далучыцца да прэзентуемага ўпершыню аб'яднанага партала беларускіх дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі пад назвай «СМІ Беларусі». Яго ідэя ў тым, каб усе дзяржаўныя СМІ прадставіць на адным рэсурсе. Там ужо змешчана 170 выданняў і кампаній, апублікавана 7000 матэрыялаў. І гэта толькі пачатак, база будзе папаўняцца.

Сёння ўвечары, у 18 гадзін, у Палацы Рэспублікі адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў XI Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая ліцера».

6 мая, зранку, усім зацікаўленым раім далучыцца да прэс-дыялогу па тэмах распаўсюджвання друкаваных СМІ, а таксама новых медыя Беларусі з удзелам найлепшых прадстаўнікоў гэтай галіны. Аматарам фатаграфіі варта дачакацца вечара, бо сёлета ўпершыню падвядуцца вынікі конкурсу «Фота Беларусі». Цырымонія ўрачыстага ўзнагароджвання пераможцаў адбудзецца ў 17 гадзін. Дарэчы, за гадзіну да яе можна паўдзельнічаць у яшчэ адным прэс-дыялогу, прысвечаным фотажурналістыцы будучыні.

7 мая, зразумела, больш увагі атрымаюць тэлебачанне і радыё. З раніцы ахвотным варта далучыцца да семінара па тэме вытворчасці і распаўсюджвання тэлевізійнага кантэнту. Таксама адбудзецца прэзентацыя радыёканалаў Белтэлерадыёкампаніі, аўтограф-сесіі вядучых ранішніх праграм каналаў АНТ, СТБ. Цікава будзе і на інтэрактыўнай пляцоўцы (з фота- і відэазонамі) канала «Космас-ТБ».

На стэндзе Выдавецкага дома "Звязда" вас, зразумела, чакаюць у любы дзень і час. Але для таго, каб дапамагчы зарыентавацца ў насычанай праграме, адзначым, што ў першы дзень тут будзе праходзіць электронная прэзентацыя праектаў «Звязды»: «70 гадоў Вялікай Перамогі», «Шляхамі вызвалення», «Урочышча Пяскі», «Паміж жыццём і смерцю». Можна будзе бліжэй пазнаёміцца з супрацоўнікамі газеты «ЛіМ», часопісаў «Родная прырода», «Алеся», «Полымя», «Нёман», «Маладосць», «Вожык», «Бярозка». У другой палове дня — аўтограф-сесіі Аляксея Чароты, Алены Мальчэўскай, Яны Явіч, Таццяны Сівец. 6 мая ў 12 гадзін завітайце на гадзінку гумару ад часопіса «Вожык». З 16 гадзін можна будзе пазнаёміцца з творчасцю маладых паэтаў. 7 мая таксама не абыдзецца без сюрпрызаў: пройдзе майстар-клас экалагічных вырабаў з дрыгаснай сыравіны ад «Роднай прыроды», адбудуцца сустрэчы з пісьменнікамі Алесем Пушкіным, Уладзімірам Мазго, Генадзем Аўласенкам.

Лілія Ананіч адзначыла, што на выставу будзе цікава завітаць і самым маладым гасцям:

— Сёлета мы размічваем усур'ёз папрацаваць з дзіцячай аўдыторый. Бо чытач выдання не з'яўляецца сам сабой. Для таго, каб у вялікіх газет былі дарослыя падпісчыкі, трэба з імі працаваць з самых малых гадоў. Таму на дзіцячай пляцоўцы будзе працаваць стэнд дзіцячай прэсы, на якім пройдуць розныя майстар-класы, конкурсы, вікторыны, пераможцы ў іх атрымаюць прызы. Мы чакаем актыўнага ўдзелу і студэнцкіх сродкаў масавай інфармацыі: абмяркуем, што павінна быць на старонках іх выданняў, каб рэальна паказваць жыццё ВНУ, тыя тэмы, якія цікавыя самой моладзі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**


Лошанский сельисполком Минского района Минской области

**ПРОВОДИТ ОБЩЕСТВЕННОЕ ОБСУЖДЕНИЕ**

**«Место размещения земельных участков для индивидуального жилищного строительства, а также строительства объектов инженерной и транспортной инфраструктуры в аг. Лошаны».**

Ознакомиться с материалами можно в период **с 05.05.2015 г. по 19.05.2015 г.** с понедельника по пятницу с 8.00 до 17.00 в здании сельисполкома по адресу: Минский район, аг. Лошаны, ул. Советская, 1.

Встреча комиссии с населением состоится **19.05.2015 г.** в здании Лошанского сельского исполнительного комитета в 14.00.

Письменные замечания и предложения от участников общественного обсуждения принимаются в Лошанском сельском исполнительном комитете по адресу: **Минский район, аг. Лошаны, ул. Советская, 1 и по телефону 8 (017) 503-23-49.**

УНП 600228670

# Важныя рэчы

## Пасланне Прэзідэнта народу і парламенту актыўна абмяркоўваецца

**Росквіт любой краіны немагчымы без моцнай эканомікі, без сучаснай, мадэрнізаванай сістэмы адукацыі, без нармальнай сацыяльнай базы, нацыянальнай культуры, якая арыентавана на выхаванне цывілізаваных, культурных людзей, сапраўдных грамадзян сваёй краіны. Нягледзячы на тое, што ў нас ёсць пэўныя абавязацельствы (у тым ліку і гістарычныя і прававыя, звязаныя з нашымі партнёрамі), асноўнае для беларускай дзяржавы — суверэнітэт, а ў дзяржаве — чалавек, асоба. Яго здароўе, бяспека, дабрабыт.**
**Гэтыя моманты знайшлі сваё адлюстраванне і ва ўжо 19-м па ліку Пасланні Прэзідэнта народу і парламенту Беларусі.**

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Найважнейшая тэма паслання, натуральна, эканоміка. Гэта бяспека дзяржавы і дабрабыт нашых людзей. Прэзідэнт правільна паставіў пытанне наконт таго, што немагчыма бясконца аказваць бюджэтную падтрымку прадпрыемствам. Калі яны не могуць самастойна працаваць, значыць, трэба іх перапрафіляваць, шукаць нейкія іншыя варыянты, каб яны пачыналі прыносіць прыбытак. Таму што ў адваротным выпадку такі шлях вядзе ў нікуды, а для грамадства гэта заўсёды дрэнна заканчваецца, бо гэтыя ўсе выдаткі павінен несці на сабе народ.

Трэба большую стаўку рабіць на развіццё малога, сярэдняга бізнесу. Заканадаўчая база для гэтага ў нас створана, і сёння не трэба казаць, што не хапае нейкіх законаў. Проста ў нас шмат рознага кштапту бюракратычных заслон пры рэалізацыі гэтых законапраектаў. І пры адкрыцці нейкага малога або сярэдняга прадпрыемства, і тады, калі праводзіцца працэдура банкруцтва... Тут найбольш актыўную пазіцыю павінны займаць нашы мясцовыя органы ўлады. Заканадаўчай базы хапае.

Найважнейшым кірункам з'яўляецца экспарт. Прэзідэнт сказаў, што мы спачатку вырабляем прадукцыю, а потым думаем, куды яе прадаць. Гэта няправільна, гэта зноў жа — шлях у нікуды. Трэба пралічваць рынкі краін, на якія нам найбольш выгадна выходзіць. Мы не павінны дзейнічаць метадам спроб і памылак. Павінна быць сістэмная праца ў гэтым плане.

Трэба рабіць дыверсіфікацыю рынкаў збыту, шукаць новыя краіны. Як вы ведаеце, у дадзеным напрамку парламент працуе вельмі актыўна. Мы ўжо атрымалі статус назіральніка ў міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), і, дзякуючы дэпутатам, больш актыўна ідзе супрацоўніцтва з В'етнамам і Камбоджай, стараемся ўстанавіць кантакты з Лаосам. Зараз мы працуем над атрыманнем статуса назіральніка ў Лацінаамерыканскім парламенце, куды ўваходзяць 23 краіны. Думаю, там вельмі вялікі рынак: гэта і Бразілія, і Аргенціна, і Чылі, і Эквадор, і Венесуэла... Трэба выходзіць на новыя рынкі, не варта зацыклівацца на дзяржавах, з якімі ўжо наладжаны кантакты, хоць, напрыклад, у той жа Расіі ёсць нявыкарыстаныя магчымасці, асабліва ў плане міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Тут таксама неабходна больш актыўна працаваць мясцовым органам улады: у іх свае бюджэты, ім трэба менш праводзіць розных узгадненняў.

**Аляксей ДЗЕРМАНТ, філосаф, удзельнік грамадскага аналітычнага праекта «Цытадэль»:**

— У Пасланні была дадзена дакладная характарыстыка адносінам з Захадам, выразна акрэслена пазіцыя, што Беларусь будзе імкнуцца паляпшаць гэтыя адносіны, Беларусь вітае, робіць намаганні і высілкі для гэтага. Але не на шкоду адносінам з Расіяй. Прэзідэнт зноў падкрэсліў, што Расія — наш стратэгічны саюзнік. Ён паведаміў, што сумеснае святкаванне 70-годдзя Перамогі адбудзецца 8 мая, і дэкляраваў, што гэта прадэманструе: мы ў гэтым сэнсе адносім сябе да «рускага свету». Гэта расставіла кропкі над «і», бо апошнім часам было шмат спекуляцый у Расіі і ў нас наконт адсутнасці беларускага лідара 9 мая ў Маскве.

Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, чаму мы імкнёмся паляпшаць адносіны з Захадам. Некаторыя палітолагі трактуюць гэта як падрыхтоўку Беларуссю нейкага плацдарма для манеўру, але гэта не так. Справа ў тым, што наша дзяржава стварае падушку бяспекі ў рэгіёне, гэта, натуральна, карысна і для Расіі. Мы прынялі на сябе функцыю міратворца, пляцоўкі для перамоў, донара бяспекі і стабільнасці, што на Захадзе зараз запатрабавана. Мы пачалі выконваць тую функцыю паспяхова, і гэтым тлумачыцца паляпшэнне нашых адносінаў з Захадам. Расія таксама нас тут не крытыкуе. Такая пазіцыя Беларусі — вельмі прагматычная і разлічаная, і, мне здаецца, найлепшая ў сітуацыі, якая склалася.

**Сцяпан БАЙЦОЎ, старшыня Лапаціцкага сельскага Савета дэпутатаў Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці:**

— Сельскія жыхары заўсёды ажыўлена рэагуюць на розныя навіны. А за выступленнем Прэзідэнта з пасланнем да беларускага народа сачылі з павышаный увагай. У нас гэтыя словы нават старэнькія бабулькі абмяркоўваюць. На вёсцы народ больш законапаслухмяны і працалюбівы, таму людзі вельмі станоўча аднесліся да Дэкрэта аб утрыманстве. Калі працаздольны чалавек не прыносіць карысць ні сваёй сям'і, ні грамадству, трэба неяк рашаць гэтае пытанне. У нас амаль 80-90% насельніцтва трымае жывёлу, ім працаваць не прывыкаць. Гэта так званы сярэдні клас, якому няма часу скардзіцца. Людзі больш звяртаюцца па кансультацыі. Здараецца, што ў дзень вырашаеш па 5 і больш розных пытанняў. Але гэта дробязі, якія мы нават не запісваем, разглядаем у рабочым парадку. Людзі зямлю дзеляць, рэгіструюцца па месцы жыхарства. На сваім узроўні мы дапамагаем, чым можна. Але не ўсё ад нас залежыць. Зараз вось ускладніліся ўмовы здачы дзяржаве малака, сталі больш жорсткімі ў адпаведнасці з расійскімі патрабаваннямі. Лічу, што павінна быць больш адчувальная дзяржаўная падтрымка для тых, хто займаецца падсобнай гаспадаркай. Людзям трэба дапамагаць і з рэалізацыяй малака, і з набыццём буйной рагатай жывёлы. Яны гэтыя грошы адпрацуюць з лішкам. Больш дасканаласці не перашкодзіць унесці і ва Указ № 100. Трэба больш жорстка ставіцца да спадчыннікаў, якія знаходзяцца толькі тады, калі іх дом спарахнеў да падмурка і мы праз суд пачынаем яго зносіць. Вось тады з'яўляюцца нашчадкі ў 5-м калене і пачынаюць прад'яўляць свае правы.

Больш складаныя задачы ставяць перад мясцовай уладай не працоўныя людзі, а так званыя ўтрыманцы. Яны, як правіла, добра ведаюць свае правы і нічога не жадаюць чуць пра абавязкі. Але ніводнае пытанне не выходзіць у нас з-пад кантролю. Ідзём на кампраміс, знаходзім рашэнне, якое задавальвае абодва бакі.

**Ганна ІЗОТАВА, шматдзетная маці, якая сёння знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску:**

— Мы з мужам вельмі любім дзяцей. У нашай сям'і іх сямёра. Справа ў тым, што такую колькасць мы дазволілі сабе, бо ў нас ёсць дах над галавой. Калісьці мы з мужам жылі ў двухпакаёвай кватэры разам з бацькамі: бацькі ў адным пакоі, а мы з дзецьмі ў другім. Калі нарадзілася чацвёртае дзіця, нам прапанавалі набыць чатырохпакаёўку... Ільготны крэдыт стаў сапраўдным выйсцем. А калі ўжо ёсць кватэра, нейкія бытавыя пытанні вырашаюцца значна лягчэй.

Але кватэра — гэта не адзіная дапамога ад дзяржавы, хаця і вельмі значная. Мы атрымліваем і адрасную сацыяльную дапамогу, і бясплатнае харчаванне для малых да двух гадоў. Да таго ж каля трох мільёнаў мы эканомім на гуртках і секцыях. Напрыклад, усе нашы дзеці атрымліваюць адукацыю ў музычнай школе, а хлопчыкі яшчэ і наведваюць гурткі «Дзюдо» і «Картынг» — і ўсё гэта бясплатна, у якасці падтрымкі для шматдзетных сем'яў. Пра бясплатнае харчаванне ў школах гаварылі і добрае, і не вельмі, але... Асабіста мне за такую дапамогу хочацца сказаць дзякуй. Калі малое пасля школы бягом ляціць у «музыкалку» і проста не паспявае зайсці дадому перакусіць, то школьныя абеды яму падаюцца вельмі смачнымі.

На днях мы сям'ёй хадзілі ў цырк... Купіць білеты на прадстаўленне на дзевяць чалавек не так проста, але гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы горада. Нас запрасілі бясплатна. І ведаеце, такія «вялікія паходы» дзецям запамінаюцца на ўсё жыццё. Так, мы ўсе не змясціліся ў машыне, бо там ужо не хапае месца. Але ж было столькі эмоцый! Такія прыемныя падарункі ад дзяржавы мы атрымліваем на працягу года не адзін раз. І я лічу гэта таксама падтрымкай!

У пасланні Прэзідэнт адзначыў, што моцная шматдзетная сям'я — ідэал грамадства. Мы з мужам з такой пазіцыяй згодны на ўсе сто. Са свайго боку пастараемся выхаваць дзяцей годнымі грамадзянамі нашай краіны.

**www.zviazda.by**

— Слухаў. Мае рацыю! Інвестары баяцца звяртацца ў нашы суды. Свае арбітражныя бліжэйшыя і больш зразумелыя, але Беларусь прававая дзяржава і ў нас таксама ўсё выразна і адкрыта. На жаль, гэта трэба даносіць не толькі да замежнікаў, але дастукацца і да сваіх.

**Мікалай САРАКОМЛЯ.**

— Дзяржпадтрымка нашых прадпрыемстваў рэальна не дае вярнуцца ў 90-я. І пра інвестараў правільна. Які толк дзяржаве ў прыцягненні тых, хто даход ёй не прыносіць. Так можна ўсё разбазарыць.

**Вольга РУДЗІЧ.**

# Героі ў сталічным небе


Фота Надзеі БУЖАН.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Хлопцы і дзяўчаты (так, былі тут і аматаркі авіямадэліравання) прыехалі з Брэста, Нясвіжа, Пінска, Наваполацка, Капыля і іншых гарадоў. Ужо на месцы многія збіралі сваіх змеяў, бо давезці іх у Мінск у гатовым да палёту выглядзе было немагчыма: некаторыя мадэлі па памеры былі большыя за свае стваральнікаў. Апараты даводзіліся да ладу, юныя канструктары рабілі апошнія ўдасканаленні.

Трынаццацігадовы Мікіта Ярмыш, навучэнец Капыльскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, займаецца авіямадэляваннем роўна год. Спачатку хлопец падабаліся мадэлі караблёў, але з цягам часу зацікавіўся і лятальнымі апаратамі. Ён захапляецца радыётэхнікай, абсталёўвае мадэлі радыёпрыладамі, маторамі.

— На спаборніцтвы я прывёз змея, названага ў гонар адразу двух герояў, — расказвае Мікіта. — Хоць Васіль Нячаеў і не беларус, я выбраў яго як аднаго з найбольш слаўтых савецкіх пілотаў-асаў. Другі — мой зямляк, Мікалай Рамашка, яго імем названа адна з вуліц у Капылі. Мяне вельмі ўражвае яго подзвіг, калі ён цаной свайго жыцця абараніў пераправу праз Бярэзіну непадалёк ад Асіповічаў. На стварэнне змея ў мяне пайшло не так шмат часу, значна больш — на дэкарыраванне. Гэта вельмі карпатлівая праца, але яе трэба выконваць, бо адна з намінацый на конкурсе — «Гераічны вандроўнік» — будзе аддадзена самаму прыгожаму апарату.

Пасля ўрачыстага адкрыцця дзеці наведалі нядаўна адкрыты інфармацыйны цэнтр па атамнай энергіі, пра які пісала «Звязда». Потым усе накіраваліся да «лётнай пляцоўкі» — пусткі на вуліцы Філімонава. Толькі на месцы спаборніцтваў стаў бачны маштаб конкурсу — якіх толькі змеяў тут не было! Простыя поліэтыленавыя, папяровыя, аб'ёмныя каробчатыя, з жорсткім каркасам і складныя... Усе ўдзельнікі змаглі праявіць фантазію і ў афармленні: нехта проста ўпрыгожыў апарат партрэтам свайго героя, хтосьці зрабіў са змея сапраўдны твор мастацтва. Была і цэлая эскадрылля авіямадэляў савецкіх самалётаў часоў Вялікай Айчыннай вайны, якую прывезлі на спаборніцтвы хлопцы са Шчучына.

**Пераможцы III рэспубліканскага конкурсу паветраных змеяў «ТэхнаЭнергія»:**

**у намінацыі «Гераічны вандроўнік» — Уладзімір ДЫЛЕЎСКІ, СШ №3 г. Нясвіжа;**

**у намінацыі «Уладар нябёсаў» — Міхаіл ЛОБАЧ, Шчучынскі раённы цэнтр тэхнічнай творчасці;**

**у намінацыі «Змяіны найвышэйшы пілатаж» — Аляксей ЛОБАН, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г. Капыля.**

— Конкурс мы праводзім у трэці раз, — расправяла загадчык аддзела тэхнічнага мадэлявання Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці Наталля БУРАЯ, адзін з арганізатараў «ТэхнаЭнергіі». — Канцэпцыю стараемся не мяняць, штогод удзельнікі прыязджаюць са змеямі, прысвечанымі Героям Савецкага Саюза. Сёлета да нас прыехала ў два разы больш удзельнікаў, чым летась. Большасць з іх — жыхары рэгіёнаў, са сталіцы зарэгістравана толькі адна заяўка. Сваім конкурсам мы хочам папулярызаваць тэхнічную творчасць і яшчэ раз нагадаць суайчыннікам пра герояў Вялікай Айчыннай вайны напярэдадні святкавання Дня Перамогі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА — ИВЕНЕЦКИЙ ПОСЕЛКОВЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Лот № 1 г.п. Ивенец, ул. Полевая, 22, кадастровый номер 622055400050000019 | 0,15 га | Вблизи водоснабжение, ЛЭП, газ | 49555200 | 9911000 | 9983550 |
| 2 | Лот № 2 г.п. Ивенец, ул. Полевая, 24, кадастровый номер 622055400050000020 | 0,15 га | Вблизи водоснабжение, ЛЭП, газ | 49555200 | 9911000 | 9983550 |

*Задаток перечисляется на р/счет № 3600614020504 ГУ МФ РБ по Минской области ЦБУ 605 г. Воложина ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код 601, УНП 600537220, Ивенецкий поселковый исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится **03 июня 2015 года в 10.00** по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 28 мая 2015 г.** (последний день подачи заявления **28 мая 2015 г. до 17.00** по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

**Контактные телефоны: (8 01772) 53 526, 51 843.**

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает об отзыве публичных оферт на заключение договора срочного банковского вклада «Интернет-депозит-Тренд» со сроком хранения 18, 24, 36 месяцев, опубликованных в газете «Звязда» 29.04.2015.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует: в извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже здания теплицы, расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Замковая, д. 19, корп. 10, опубликованное в газете «Звязда» от 25.04.2015, вносится изменение: **Вместо:** «аукцион состоится 07.05. 2015 г.», **читать:** «аукцион состоится 13.05.2015 г.». **Вместо:** «документы принимаются по 13.05.2015 г.» **читать:** «документы принимаются по **07.05.2015 г.**».

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. www.cpo.by** УНП 191021390

■ Пасля падзеі

# ГЭТА БЫЛО ПРЫГОЖАЕ СВЯТА

## Беларускія гімнасткі заваявалі дзевяць узнагарод на чэмпіянаце Еўропы ў Мінску

**Завяршылася першынство старога кантынента па мастацкай гімнастыцы, якое праходзіла ў мінулыя выхадныя ў Мінску. Беларускія грацыі перавыканалі задачу галоўнага трэнера зборнай Ірыны Ляпарскай і заваявалі дзевяць узнагарод.**


Фота БЕЛТА.

За два першыя спаборніцкія дні беларускі выйгралі два сярэбраныя медалі ў групавых практыкаваннях. Адна ўзнагарода ў юніёрак, другая — у дарослых гімнастак. Але самым багатым на цырымоніі ўзнагароджання днём стала нядзеля.

Апошні спаборніцкі дзень чэмпіянату Еўропы для Беларусі пачаўся з залатых медалёў. У фінале групавых практыкаванняў з пяццю мячамі нашы юніёркі абышлі галоўных канкурэнтак — расіянак.

Завяршальным акордам спаборніцкай часткі чэмпіянату сталі выступленні ў індывідуальных практыкаваннях. Лідар зборнай Меліціна Станюта заваявала пяць узнагарод: тры «срэбры» (абруч, стужка, камандныя спаборніцтвы) і дзве «бронзы» (практыкаванні з мячом і булавамі).

— Перад сабой не ставіла ніякіх канкрэтных задач па медалях, якую колькасць трэба выйграць. Галоўнае для мяне было — правесці ўвесь чэмпіянат роўна, паказваць стабільныя вынікі. Хачу ўсім падзякаваць за падтрымку. Атмасфера падчас турніру была ўзрушаючая. Вельмі прыемна выступаць дома, калі нават ахоўнікі ў «Мінск-Арэне» адчыняюць дзверы і кажуць: «Дзяўчаты, мы з вамі!», — адзначыла **Меліціна** пасля завяршэння спаборніцтваў.

Другая беларуска **Кацярына ГАЛКІНА** стала ўладальніцай сярэбранай узнагароды ў камандных спаборніцтвах разам з Меліцінай Станютай. Бронзавыя ўзнагароды спартсменка заваявала ў асобных практыкаваннях з абручом і з булавамі, што стала добрым вынікам для маладой гімнасткі.

— Яна ўварвалася, як віхор. «Расціснула» суддзяў: яны самі не ўсведамляюць, што даюць ёй такія адзнакі. Але гэтых ацэнак Каця вартая ўжо даўно. Яна вельмі таленавітая дзяўчынка, — ацаніла выступленне Галкінай Ірына Ляпарская.

Першыя прыступкі п'едэстала па традыцыі засталіся за расіянкамі Янай Кудраўцавай і Маргарытай Мамун.

Завяршылася першынство Еўропы двухгадзінным гала-прадстаўленнем.

Пасля заканчэння чэмпіянату **Ірына ЛЯПАРСКАЯ** адзначыла, што задаволена як выступленнем дзяўчат, так і арганізацыяй усяго першынства.

— Мы ставілі задачу мінімум — атрымаць два медалі. А калі яшчэ трэці — проста выдатна. Але ў мяне іх столькі, што я нават не ведаю... Дзяўчаты малайцы. Гэта было годнае выступленне. Вядома, былі і памылкі, і ўдалыя моманты, але трэба разумець, што графік вельмі напружаны, канкурэнцыя сур'ёзная і дзяўчаты — не робаты. Мы, як арганізацыйны бок, перажывалі за правядзенне кантынентальнага форуму. Цяпер магу сказаць, што па арганізацыі, па афармленні «Мінск-Арэны», па атмасферы ў зале чэмпіянат атрымаўся. Гэта было сапраўднае свята спорту, дзякуй усім, хто падтрымаў Беларускую асацыяцыю гімнастыкі і дапамог правесці гэты кантынентальны форум. Мы вельмі стаміліся ад арганізацыі чэмпіянату, але яна прынесла вялікае задавальненне. «Мінск-Арэна» нават зусім па-іншаму выглядае на мастацкай гімнастыцы.

Беларуская каманда заняла другое месца ў агульным заліку, на першым месцы Расія — шэсць залатых медалёў і два сярэбраныя.

Чарговы XXXII чэмпіянат Еўропы пройдзе з 13 па 19 чэрвеня 2016 года ў ізраільскім Халоне.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Гандаль

# ЗАСТАНЕЦЦА ТОЛЬКІ «КАМАРОЎКА»?

## Спецыялісты сталічнай нерухомасці прагназуюць выцісканне мясцовых рынкаў і кірмашоў буйнымі гандлёвымі цэнтрамі

**Імклівае развіццё гандлёвых цэнтраў у Мінску ў бліжэйшай будучыні прывядзе да закрыцця або пераарыентацыі большасці рынкаў і кірмашоў сталіцы, лічыць <u>кіраўнік праектаў агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Дзмітрый ДРОБЫШАЎ.</u>**



Хутка патаргавацца можна будзе толькі на «Камароўцы»?

### БРЭНДЫ ГАТОВЫ ДА ЗНІЖАК

Эксперт паведамляе, што рынак гандлёвых цэнтраў стаў адным з самых хуткарослых у галоўным мегаполісе краіны. Толькі сёлета горад павінен прырасці на 150 тысяч такіх «квадратаў». А сёння дэвелаперы пачынаюць барацьбу не толькі за арандатараў, але і за трафік. Каб прыцягнуць наведвальнікаў, у ход ідуць велізарныя галерэі на сотні магазінаў, сямейна-забаўляльныя цэнтры і фармат распродажаў. Традыцыйным рынкам з прылаўкамі цяпер няма чаго ім супрацьпаставіць.

Разам з уласнікамі гандлёвых цэнтраў сталі актыўна дзейнічаць і аператары. Шматлікія кампаніі асвойваюць мас-маркет і пераарыентуюцца на аўдыторыю з узроўнем даходу ніжэй сярэдняга. Гэта звязана з тым, што пакупніцкая здольнасць насельніцтва паменшылася. «Брэндавыя сеткі імкнуцца зніжаць цэны і прадастаўляць зніжкі, пры гэтым стаўка робіцца не на высокую маржу, а на аб'ёмы продажаў. Гэта практычна не пакідае шанцаў рынкам і кірмашам, якія за апошнія гады і без таго амаль разгубілі сваю аўдыторыю», — удакладняе сітуацыю спецыяліст.

### ЗНІКНЕННЕ РЫНКАЎ ПАЧАЛОСЯ

Аналітыкі ўпэўнены, што кірмашовы гандаль паступова сыходзіць у мінулае. У 2013 годзе ў Мінску знеслі Чэрвеньскі рынак, а нядаўна стала вядома пра закрыццё рынку каля гандлёвага цэнтра «Экспабел». Тэндэнцыя толькі збольшага звязана з жаданнем уладаў перайсці да больш цывілізаваных форм гандлю. Ключавую ролю адыграў эканамічны фактар: калі ў гандлёвыя цэнтры патокі пакупнікоў у апошнія гады раслі, то традыцыйныя рынкі перажывалі бурны спад. «Сталіца перайшла на новы ўзровень, а тыя, хто не паспеў своечасова падрыхтавацца да сучасных умоў, былі вымушаны мірыцца са складанасцямі або зачыніцца — гэта натуральны працэс», — звярнуў увагу Дзмітрый Дробышаў.

У той жа час гандлёвыя цэнтры працягваюць пашыраць свой уплыў. На замену «адзінокім» аб'ектам прыходзяць гандлёвыя кварталы. Амаль у кожным раёне прадстаўлены магутны шопінг-цэнтр, які замыкае на сабе асноўны трафік пакупнікоў. Так, у Маскоўскім раёне такой знакавай кропкай выступае ГЗЦ «Тытан» з тэматычнымі зонамі і цэнтрам забаў, у Цэнтральным — «Замак» з прасторнай галерэяй, а ў цэнтры горада — падземны цэнтр «Сталіца». У Фрунзенскім раёне на гэты статус прэтэндуе GreenCity, але пакуль яго адкрыццё зацягваецца.

**Пераарыентуюцца на аўдыторыю з узроўнем даходу ніжэй сярэдняга.**

Увогуле Мінск сёння развіваецца ў двух напрамках — будаўніцтва буйных гандлёва-забаўляльных цэнтраў і адкрыццё рэгіянальных аб'ектаў у спальных раёнах. Перспектыўныя гіганцкія молы цяпер найбольш уразлівыя: прадстаўленыя ў краіне рытэйлеры не могуць забяспечыць іх запаўняльнасць, а сусветныя брэнды ў краіну не спяшаюцца. Таму некаторыя дэвелаперы развіваюць інстытут франчайзінгу — адкрываюць уласныя крамы пад вядомымі шыльдамі. Для ўжо адкрытых гандлёвых цэнтраў сітуацыя больш спакойная, паколькі яны паспелі заручыцца падтрымкай буйных аператараў.

### ВЫЖЫВУЦЬ ХІБА ШТО ПРАДУКТЫ

Вытрымаць моцную канкурэнцыю з боку гандлёвых цэнтраў змогуць толькі некаторыя сталічныя рынкі. «Гэта, у прыватнасці, тычыцца «Камароўкі» і «Ждановічаў», жыццёвы цыкл якіх далёкі ад завяршэння. Яны, вядома, ужо не змогуць вярнуць сабе былы поспех, але ў стане ўпэўнена развівацца. Многае, вядома, будзе залежаць ад таго, ці змогуць яны адаптавацца да ўзрослых чаканняў пакупнікоў і знайсці сваю нішу. Так, «Камароўка», хутчэй за ўсё, застанецца выключна прадуктовым рынкам», — падкрэсліў эксперт.

Тым больш што ў свеце цяпер ёсць нямала прыкладаў, калі рынкі карыстаюцца велізарным поспехам у гарадах з высокай канцэнтрацыяй гандлёвых цэнтраў. «Каб у гэтым пераканацца, дастаткова наведаць рынак Бакерыя ў Барселоне або Гранд-базар у Стамбуле», — патлумачыў сваю пазіцыю прадстаўнік агенцтва.

**Сяргей КУРКАЧ**


БЕЛАРУСБАНК

**Публичная оферта (предложение)
о начислении поощрительного процентного дохода
по срочным банковским вкладам в белорусских рублях**

**«Интернет-депозит»,
«Интернет-депозит-Презент»,
«Интернет-депозит-Тренд»**

ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях

**в период с 28.04.2015 по 04.05.2015 (включительно):**
- «Интернет-депозит без ежемесячного перечисления процентов» – в размере 4% годовых;
- «Интернет-депозит-Тренд» со сроком возврата 3, 12, 18, 24, 36 месяцев (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере 2,9% годовых.

Начисление и выплата поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 28.04.2015 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 04.05.2015 (включительно) в порядке, установленном соответствующим договором банковского вклада (депозита) для начисления и выплаты основных процентов.

**в период с 29.04.2015 по 04.05.2015 (включительно):**
- «Интернет-депозит с ежемесячным перечислением процентов» – в размере 4% годовых;
- «Интернет-депозит-Презент» – в размере 5,5% годовых;
- «Интернет-депозит-Тренд» со сроком возврата на 6 месяцев (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере 2,9% годовых.

Начисление и выплата поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 29.04.2015 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 04.05.2015 (включительно) в порядке, установленном соответствующим договором банковского вклада (депозита) для начисления и выплаты основных процентов.

**Подробности по телефону 147,
на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**


IIHF 2015 ICE HOCKEY WORLD CHAMPIONSHIP CZECH REPUBLIC Prague - Ostrava

# Стартавалі з перамогі і паражэння ў авертайме

**Галоўная хакейная каманда краіны распачала ў чэшскай Астраве чарговы чэмпіянат свету. І старт у калектыва Дэйва Льюіса атрымаўся неблагім. Нашы хлопцы атрымалі звышважную вікторыю ў паядынку са Славеніяй (4:2) і саступілі ў авертайме славакам (1:2).**

Ужо даўно прайшлі тыя часы, калі славенцы былі лёгкай здабычай для хакейных флагманаў. На мінулай Алімпіядзе ў Сочы «рысі» наогул апынуліся ў васьмёрцы лепшых. Хакеісты з гэтай невялічкай краіны выступаюць за чэшскія, расійскія і шведскія каманды. Ну а зоркай зборнай, безумоўна, з'яўляецца нападаючы амерыканскага «Лос-Анджэлес Кінгз» Анжэ Копітар. Праўда, спыніць беларусаў у сапернікa не атрымалася. Нашы чатыры разы адпраўлялі шайбу за спіну славенскаму варатару: спачатку Андрэй Стась, пасля Андрэй Касцыцын, Аляксей Калюжны і Аляксандр Кітароў. Славенцы забівалі двойчы.

— У першым перыядзе была даволі роўная гульня, — заўважыў пасля сустрэчы **Дэйв Льюіс, галоўны трэнер зборнай Беларусі**. — У другім мы пачалі кідаць больш і закінулі шайбу яшчэ раз. У заключны дваццаць хвілін славенцы прымусілі нас нервавацца. Аднак напрыканцы мы закінулі ў пустыя вароты, і гэта была добрая кропка.

— Славенія – вельмі сур'ёзны сапернік, — прызнаўся наш варатар Кевін Лаланд. — У іх у складзе ёсць сапраўдныя майстры. Напрацягу 60 хвілін мы рабілі ўсё правільна, а таму здолелі перамагчы.

Між іншым, менавіта Кевін прадэманстраваў выдатную гульню ў варотах у наступнай сустрэчы супраць Славакіі. Лік у сустрэчы адкрыў Сяргей Касціцын, аднак літаральна праз хвіліну сапернік яго зраўняў, а ў авертайме здолеў здабыць перамогу – 2:1.

— Ведалі, што нам будзе супрацьстаяць класная каманда з граматнымі выканаўцамі, два з якіх гуляюць у НХЛ, — адзначыў трэнер нашай зборнай. — Пасля матча скажу хлопцам, што ганаруся тым, як яны справіліся.

— Здолелі закінуць першымі, аднак напрыканцы не хапіла канцэнтрацыі, каб утрымаць пераможны лік, — рэзюмаваў вынік сустрэчы нападаючы Арцём Дзямкоў.

Свой чарговы матч зборная Беларусі правядзе сёння. Нашай камандзе будзе супрацьстаяць Данія. Пачатак трансляцыі на тэлеканале «Беларусь 1» у 17:10.

**Тарас ШЧЫРЫ**



■ Пераможны май у маёй біяграфіі

# «МОЙ БАЦЬКА ВАЯВАЎ»



**Напярэдадні 9 Мая наша размова з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталем БУСЬКО пра памяць, гарантыю бяспекі для Беларусі і свету і пра адбітак, які Вялікая Айчынная вайна пакінула на некалькіх пакаленнях савецкіх людзей.**

***— Віталь Леанідавіч, мы з вамі належым да пасляваеннага пакалення. Тым не менш, Вялікая Айчынная займае ў нашым жыцці досыць значнае месца. Раскажыце, што яна азначае для вас?***

— Мой бацька ваяваў. І першыя згадкі ў маім жыцці звязаны з вайной, з яе следам на нашай зямлі: ў 1959-м у нашым двары капалі калодзеж і выкапалі... гранату. Ад нас, народжаных у 50-я, вельмі адрозніваліся дзеці, якія нарадзіліся або перад самай вайной, або адразу пасля яе. Гэта было асаблівае пакаленне, яно было старэйшае за свой біялагічны ўзрост. Яно амаль адразу было дарослым.

Яшчэ адна рыса пасляваеннага часу — наяўнасць вялікай колькасці зброі ў мірнага насельніцтва: практычна ў кожнага быў або шмайсер, або карабін. Для вясковых хлопчыкаў у Беларусі не было праблем пайсці і накапаць... патронаў.

Першыя цукеркі я ўбачыў гадоў у дзесяць. А да таго мы ласаваліся смажаным цукрам. Электрычнасць з'явілася, калі ў школу пайшоў. Быў у нас радыёпрыёмнік — бацька з вайны прынёс...

Бацьку майму было 19 гадоў, калі пачалася вайна. Ён быў камсамольцам. Усё лета 1941-га сыходзіў у начное, пасвіў коней, каб дома не начаваць. Потым мясцовая моладзь арганізавалася ў падпольную групу: збіралі і хавалі зброю, пісалі лістоўкі. Восенню наступнага года стварылі партызанскі атрад «Камсамолец».

У партызанах бацька быў мінёрам, і насуперак вядомай прыказцы яму двойчы ўдалося выжыць праз мінёрскія памылкі. Да таго, як партызанам сталі скідваць узрыўчатку з самалётаў, і калі яе скідвалі недастаткова, тол выплаўлялі з нямецкіх снарадаў. Аднойчы група, у складзе якой быў мой бацька, замініравала дарогу, аднак яму здалося, што міна дрэнна замаскіравана, ён вярнуўся і выпадкова наступіў на яе. Адбыўся выбух запалу і дэтанатару, на шчасце, асноўны зарад не спрацаваў — бацьку адкінула выбуховай хваляй, але не забіла.

Немцы ўжо восенню 1942-га сталі прымаць сур'ёзныя меры для бяспекі чыгункі і аўтамабільных дарог. Абапал іх высякалі лес, усталёўвалі сігнальныя агароджы, абсталёўвалі мінныя палі, ахоўвалі станцыі і палотны паміж імі. Апроч таго, перад цягнікам пускалі дрызіну з пяском. Задача партызан была паспець закласці ўзрыўчатку перад праходам цягніка і пасля таго, як пройдзе дрызіна. Адыходзіць трэба было так, каб не трапіць пад вугал абстрэлу нямецкіх аўтаматчыкаў — уздоўж палатна. Падчас адной такой аперацыі бацька не паспеў адбегчы і яго пасля ўзрыву накрыла вагонам. Сябры былі ўпэўнены, што ён загінуў, але глыбокі снег выратаваў бацьку жыццё.

Ён не надта любіў расказваць пра гэтыя выпадкі, увогуле, вайну згадваў пад настрой, часцей за ўсё, на свята Перамогі. Але адну гісторыю расказваў з задавальненнем. Пра любімую кабылу. Неяк ён ехаў ноччу з задання, драмаў, а па дарозе ў яго былі могілкі, і на іх — засада. Кабыла раптам стала. Адзін з паліцаяў не вытрымаў і стрэліў, бацька адразу павярнуў кабылу і пад кулямі ўжо паскакаў прэч. Так кабыла выратавала яму жыццё.

У 1944-м бацька спачатку адбудоўваў дамы ў роднай вёсцы, усё на той ж сваёй кабыле вазіў з лесу бярвёны, а потым папрасіўся на фронт і пасля перападрыхтоўкі стаў камандзірам артылерыйскай устаноўкі, быў узнагароджаны медалямі за вызваленне Варшавы, Будапешта і ўзяцце Берліна. Ён таксама часта згадваў з вялікай горыччу, асабліва ў Дзень Перамогі, як 2 мая, калі яны ехалі па Берліне, снайпер забіў іх кіроўцу. Дэмабілізаваўся ён у 1946 годзе.

**На жаль, зараз гістарычная забыўлівасць напаткала лідараў некаторых краін. І тут ужо ні ветэраны, ні мы з вамі ім не дапаможам, бо, напэўна, некаму выгадна, каб гэтую вайну забылі.**

***— Як вайна паўплывала на пакаленне вашага бацькі?***

— Іх адрознівала дабрыня. Яны ўмелі цаніць жыццё. Жылі бедна, але заўсёды было месца святу. Яны з задавальненнем збіраліся разам, пелі песні. А яшчэ ў іх была вельмі моцная вера ў тое, што яны рабілі. Тыя, хто выжыў у страшэннай вайне, так горача марылі пра мірнае жыццё, што цяжкасці іх не пужалі. А цяжка было неймаверна. Першы час не было ў што даіць кароў. Немцы ўсё знішчылі або вывезлі. Араць не было на чым, вазіць не было на чым, сеяць не было чым. Але яны не сумавалі, дамы будавалі па крузе: аднаму паднялі два бервяны, потым другому...

У іх было вострае пачуццё справядлівасці. Памятаю, як моцна бацька перажываў, калі недзе наверсе прымалася несправядлівае рашэнне. Яшчэ яны ўмелі цаніць тое, што мелі. Шафа ў доме з'явілася — свята!

І яшчэ адна рыса ўласціва гэтаму пакаленню: вернасць. Мае бацькі пражылі разам 57 гадоў, выхавалі трох дзяцей, дачакаліся праўнукаў...

Аўтарытэт бацькі для мяне заўсёды быў вельмі высокі. Усё сваё жыццё я імкнуўся не падвесці яго. Калі быў дзіцем, то самай жахлівай была думка пра тое, што бацьку ў школе могуць сказаць, што яго сын разгільдзяй. Самай высокай адзнакай было, калі бачыў, што бацька мной ганарыцца. Прыклад бацькі — гэта стрыжань, на якім я будаваў сваё жыццё. Ён казаў: «Сынок, запомні адно: за нейкі ўчынак ты можаш апраўдацца перад іншымі, але перад сабой — ніколі, цябе трэба будзе жыць з тым, што ты зрабіў».

Калі бацькі не стала ў 2008 годзе, я доўга не мог прыйсці ў сябе. Пустата пасля яго сыходу муліць душу дагэтуль.

***— Што са спроб перагляду вынікаў Вялікай Перамогі больш за ўсё турбуе вас — сына ветэрана?***

— Мы выхаваны на ідэалах, якія стваралі нашы бацькі. Калі з'явіліся першыя спробы абяліць калабарантаў, мой бацька быў абураны, ён казаў: «Яны былі горшыя за немцаў, гэта былі звяры». Ён сваімі вачыма бачыў спаленыя вёскі ў Беларусі, закатаваных людзей, лагеры смерці ў Польшчы. Таму апраўданне фашызму было для яго немагчымым. Разам з тым, ён быў рэалістам і прызнаваў уклад саюзнікаў у Перамогу, казаў: «Калі б не другі фронт, не дапамога з Захаду, хто б з нас дажыў да мірнага часу?» Яго ацэнкі тых падзей былі заўсёды цвярозымі, але ён не паверыў бы, калі б яму сказалі, што праз 70 гадоў пасля Перамогі над фашызмам славяне будуць страляць адзін у аднаго.

***— Як вы думаеце, калі з намі не застанецца ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, адстаяць праўду пра яе будзе цяжэй?***

— Для пасляваеннага пакалення нічога не памяняецца. Мы надта добра памятаем доўгае рэха вайны. Але справа ў тым, што павялічваецца колькасць людзей, якія ўвогуле нічога не ведаюць пра тую вайну. Яны не даюць ацэнак, але і самой вайны для іх быццам бы не было. І заўсёды ёсць невялікая колькасць людзей, якія ўсім незадаволены. Маўляў, «калі б мы не выйгралі тую вайну, мы б уволю пілі баварскае піва». Вось такія разважанні, цалкам памылковыя, небяспечныя. Бо праўда ў тым, што ў адпаведнасці з «Заўвагамі і прапановамі па Генеральным плане Ост», якія былі складзены нямецкім міністэрствам акупаваных усходніх тэрыторый у снежні 1941 года, 75 працэнтаў беларусаў і 65 працэнтаў украінцаў прапаноўвалася перасяліць ў Сібір, а астатнія падлягалі анямечванню.

Той, хто забываецца на сваю гісторыю, не мае будучыні. На жаль, зараз гістарычная забыўлівасць напаткала лідараў некаторых краін. І тут ужо ні ветэраны, ні мы з вамі ім не дапаможам, бо, напэўна, некаму выгадна, каб гэтую вайну забылі. Іншая справа — прасты народ. Ён помніць.

***— На адлегласці ўсяго ў тысячу кіламетраў ад нашай мяжы вайна ўсё яшчэ застаецца магчымай. Вы лічыце — для Беларусі няма пагрозы?***

— Сама гэтая сітуацыя ў суседняй з намі краіне — жудасная. Яна не можа не датычыцца нас не толькі таму, што яна побач, не толькі таму, што славяне ваююць самі з сабой, але і таму, што там — шмат беларусаў, а ў нас — шмат украінцаў. Так склалася. Так мы паступалі вучыцца падчас існавання адзінай дзяржавы, так нас размяркоўвалі пасля навучальных устаноў.

Войны бываюць вызваленчыя, справядлівыя, заваёўніцкія, але ў гэтай вайне на Украіне — сем праўдаў адначасова. Пра якую перамогу ў ёй можна казаць?

Май 1945 года навучыў нашых бацькоў, што перамога патрэбна адна на ўсіх. «Адна на ўсіх — мы за цаной не пастаім». Сем перамог не бывае. Да канфлікту ва Украіне падключылася сусветная супольнасць, але ніхто яго не вырашыць, акрамя самой Украіны. Паглядзіце, колькі было прыкладаў у гісторыі: В'етнам, Афганістан... Украінцы павінны зразумець, што гэта — іх зямля, іх народ, і ў іх можа быць толькі адна перамога.



**Пры ўсіх рэгаліях.**
**Леанід Сяргеевіч БУСЬКО. 2004 год.**

Надта шмат ужо пралілося чалавечай крыві, каб падзеі 2014 года было лёгка дараваць і забыць. Але няма іншага выйсця, як толькі садзіцца разам і дамаўляцца, як жыць далей, як спыніць узаемнае забойства. Патрэбны качы круг, народнае веча або нешта падобнае. Інакш краіны не стане.

Што тычыцца Беларусі, то нас заўсёды адрознівала ўменне выжываць у любой сітуацыі і разважлівасць. Мы больш цярпімыя да тых, хто інакш думае, інакш верыць, інакш выглядае, інакш жыве. Беларусы — мудры народ. Яму часта было несалодка, але ён разумее, што суседзяў не памяняеш, з імі трэба ўжывацца. Наш народ добра ўсведамляе, што чужынцы не будуць клапаціцца пра нашу зямлю, што ніхто, акрамя нас саміх, не зробіць нашу краіну багатай, бяспечнай і прыгожай.

Думаю, у Беларусі ёсць яшчэ адна важная рэч — адсутнасць вялікіх разрываў паміж сацыяльнымі групамі, паміж горадам і вёскай, паміж працоўнымі і інтэлігенцыяй, паміж бізнесменамі і небізнесменамі, паміж жыхарамі ўсходніх рэгіёнаў і жыхарамі заходніх.

Пра здароўе грамадства мяркуюць па ўвазе да старых і па дагледжанасці дзяцей, астатнія за сябе могуць пастаяць самі. Тое, што старыя і дзеці ў нас абаронены, традыцыі жывыя, памяць не згублена, дазваляе спадзявацца, што катаклізмы, падобныя да тых, што адбываюцца ва Украіне, нас мінуць. Рознага кшталту цяжкасці, безумоўна, будуць, без іх не абыходзіцца ніякае жыццё, але мы зробім усё, каб не дапусціць беззаконнасць і ўзброенае супрацьстаянне на сваёй зямлі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Мы памятаем!

# ПОБАЧ З ВЕТЭРАНАМІ — КРУГЛЫ ГОД

Фота Надзеі БУЖАН.




**Дайсці да кожнага ветэрана — менавіта такая задума дэкларуецца падчас святкавання Дня Перамогі ў апошнія гады. Добры прыклад іншым у гэтым сэнсе падае Беларуская натарыяльная палата. Яна ўзяла пад сваё «крыло» трыццаць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і аказвае ім розную дапамогу. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на ўрачыстым віншаванні ўдзельнікаў вайны са святам Перамогі ў натарыяльнай канторы №2 Кастрычніцкага раёна сталіцы.**

У гэты дзень віншавалі трох ветэранаў, якія жывуць непадалёк. Якнияк, але нават па падарункі людзям сталага ўзросту праз увесь горад ехаць складана. Але галоўныя героі мерапрыемства выглядалі, што ім цяжка, не падавалі. Жанчыны — Марыя ЯГАДНІЦЫНА і Вольга ГАЙДЫМ — прасілі не здымаць іх зблізку, маўляў маршчыны бачныя. Мікалай КУЛІК прыйшоў на віншаванне са сваёй сужэнкай Меланьяй. З першых жа хвілін ветэраны ўключыліся ў дыялог, відаць, размова для іх — сапраўды найлепшы падарунак...

— Усё, што мы перажылі, трэба распавесці людзям, каб ніхто і ніколі больш нават не думаў пра тое, каб распачаць вайну, — сказала адна з ветэранаў, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз блакаднікаў Ленінграда» Марыя Ягадніцына. — Тое, што мы ўжо 70 гадоў жывём у міры і сяброўстве з іншымі — вялікае дасягненне. Магу зазначыць, што ўдзельнікам вайны ў Кастрычніцкім раёне Мінска надаюць нямала ўвагі, але вельмі хацелася б, каб гэта не абмяжоўвалася толькі святамі. Трэба разумець, што надта шмат абаронцаў нашай краіны зараз не могуць самастойна выйсці на вуліцу, прыняць удзел у агульным святкаванні. І ім трэба дапамагаць у першую чаргу ў будні.

— З нашымі ветэранамі мы працуем даўно і на пастаяннай аснове, — распавяла загадчык натарыяльнай канторы №2 Кастрычніцкага раёна Мінска Таццяна Паўловіч. — Стараемся заўсёды падтрымліваць з імі кантакт, дапамагаем у самых розных пытаннях. Напрыклад, аказваем ім прававую кансультацыю. Гэта людзі сталага ўзросту, якія карыстаюцца паслугамі натарыусаў, і мы заўсёды гатовы ім дапамагаць. Таму сённяшнее мерапрыемства — толькі вяршыня айсберга. Насамрэч мы побач з нашымі героямі круглы год.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

■ Элітнае жыллё

# УТУЛЬНЫ ДВОРЫК З УЛАСНЫМ ФАНТАНАМ ДЛЯ ШАСЦІ ДАМОЎ

## У сталіцы ствараецца жылы комплекс, дзе машыны пад вокнамі вока не мазоляць

**Калі мужчына пачынае сталець, то для яго на першае месца выходзяць сям'я, праца з добрым заробкам і жыллё. Уласнае жыллё, якое ты сам пабудаваў або купіў. Што гэта будзе за жыллё і дзе — тут кожны вырашае самастойна. Галоўнае, каб быў адпаведны выбар.**

### СТАТУС КВАРТАЛА МАЕ ЗНАЧЭННЕ

У ціхім цэнтры сталіцы, у квартале вуліц М. Багдановіча — В. Харужай — Куйбышава — праспект Машэрава, працягваецца будаўніцтва жылога комплексу прынцыпова новага фармату. Галоўная адметнасць жылой забудовы — яе высокі статус. Трэба сказаць, што генпадрадчык будаўніцтва «Мінскпрамбуд» гучна заявіў аб сваім першым праекце прэміум-класа ЖК «Прэстыжына» ўжо летась. Тады ў межах нацыянальнай прэміі Realt Golden Key 2014 (сфера нерухомасці) яго праект атрымаў першае месца ў намінацыі «Жылы комплекс прэміум-класа».

А праект гэты і сапраўды ўнікальны. З агульнай канцэпцыяй забудовы тэрыторыі, якая займае каля 4 гектараў зямлі, журналістаў знаёмілі **начальнік аддзела продажаў акцыянернага таварыства «Трайпл» Павел ПРАТАСОЎСКІ** і **старшыня назіральнага савета гензабудоўшчыка «Мінскпрамбуд» Уладзімір НЯХАЙ.**

### МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ

Ужо сёння да будпляцоўкі падведзены ўсе знешнія сеткі. Тэрыторыя будучага комплексу цяпер абгароджана ад знешняга свету будаўнічым плотам. Яго потым заменяць на пастаянную агароджу з адным уездам для жыхароў праз КПП з кругласутачнай аховай і трыма брамкамі з замкамі. Таму трапіць у гэтую жылую зону змогуць толькі жыльцы і запрошаныя госці. Жыльцам раздадуць чыпы, па якіх яны змогуць адкрываць брамкі і пад'езд.

На тэрыторыі комплексу кругласутачна будзе весціся відэаназіранне. Запісы з тэрыторыі будуць захоўвацца 12 дзён, з паркінга — месяц. Акрамя гэтага, на цэнтральным ўездзе кругласутачна будуць працаваць два ахоўнікі, таму кансьержы ў дамах не прадугледжаны. Увогуле жылы масіў будзе складацца з 4-х дзевяціпавярховых «слупкоў» і двух васьміпавярховых дамоў на 3 і 4 пад'езды, аб'яднаных у закрыты комплекс. Засяляць першы дом плануюць ужо летам, ключы ад яшчэ двух уладальнікі кватэр атрымаюць у пачатку 2016 года.

На шэсць дамоў тут запланавана толькі 291 кватэра, жыхары якіх будуць цалкам забяспечаны машына-месцамі ў падземных паркінгах (318). На знешняй частцы дваровай тэрыторыі дадаткова будзе абсталявана 100 парковачных месцаў. Машыны ў цэнтр комплексу заехаць не змогуць, бо там будзе выключна пешаходная зона з дзіцячымі пляцоўкамі, а самым цікавым месцам для маладых мам стане прыгожы фантан.

### ТРОХМЕТРОВЫЯ СТОЛІ ПЛЮС СУЦЭЛЬНАЯ ГУКАІЗАЛЯЦЫЯ

Дамы маюць цагляныя сцены, абабітыя ўцяпляльнікам таўшчынёй 140 мм. Фасад будынка камбінаваны: мокры і мае вентыляцыю, што дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць у доме сістэму ацяплення, а уласнікам жыць у цёплай кватэры. Зразумела, што жыллё ў гэтых дамах будзе каштаваць даражэй, чым у стандартных «панэльках» і звычайных каркасных, аднак потым уладальнікі цёплых метраў пачнуць эканоміць на аплаце за ацяпленне.

**На тэрыторыі комплексу кругласутачна будзе весціся відэаназіранне. Запісы з тэрыторыі будуць захоўвацца 12 дзён, з паркінга — месяц.**

Лесвічныя клеткі і калідоры ў месцах агульнага карыстання аздоблены керамагранітам, а сцены — каменьчыкавай дэкаратыўнай тынкоўкай. У кожным пад'ездзе ўстаноўлены па два нямецкія ліфты грузападымальнасцю 630 і 1000 кілаграмаў. Ліфтавыя шахты аддзелены ад жылых памяшканняў, што цалкам выключае пранікненне шуму ад работы і так практычна бясшумных імпартных хуткасных ліфтаў.



У саміх кватэрах усё прадугледжана для камфортнага пражывання. Уся разводка ацяплення гарызантальная. Кожнаму ўласніку будзе выдадзена карта з планіроўкай кватэры і размяшчэннем труб. Гэта дапаможа правільна рабіць аддзелачныя работы. Жыхары памяшанняў дакладна не будуць ведаць, што робяць суседзі зверху ці знізу дзякуючы шматслойнасці падлогі. Яе таўшчыня ў 120 мм складаецца з керамзітабетону, успененага поліэтылену і цэментава-пясчанай сцяжкі. Плюс 200 мм складае пліта перакрыцця. Гэтым забяспечваецца поўная гукаізаляцыя ў кватэры.

Пакоі даволі прасторныя, з нетыповымі пакуль нават для сталіцы вялікімі вокнамі, лоджыі з панарамным шкленнем і вышынёй столяў па ўсім жыллі ў 2,95 метра. Уладзімір Няхай асобна спыніў увагу на вокнах, бо тут устаноўлены замежныя шклопакеты з пяцікамерным профілем, якія ў параўнанні са звычайнымі на 30% паляпшаюць шумаізаляцыю і дапамагаюць захоўваць у кватэры цяпло. У кожнай кватэры прадугледжаны індывідуальныя вентыляцыйныя каналы, ізаляваныя адзін ад аднаго. У першую чаргу гэта пазбавіць жыхароў ад шуму, якія распаўсюджваюцца праз традыцыйныя вентшахты, акрамя таго, цалкам выключаюцца і пахі ад суседзяў. Усе сцены ў кватэрах роўныя і добра атынкаваныя. Пры гэтым тынкоўка выканана спецыяльнымі сумесямі, якія адрозніваюцца тым, што ў іх складзе адсутнічаюць солі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ДА ПЕРШЫХ ДЗЁН ЛЕТА — СУР'ЁЗНЫЯ ЗНІЖКІ

Аднапакаёвыя кватэры тут цяжка назваць маленькімі, бо агульная плошча іх складае каля 50 квадратных метраў, у двухпакаёвых — ад 67-мі. У шматпакаёвых кватэрах метраж будзе вагацца ўжо ад 87 да 185 «квадратаў». Як паведамляе аддзел продажаў Мінскпрамбуда, у кожнай кватэры свая цана — у залежнасці ад паверха і спосабу аплаты. Танней прапануюцца ніжнія паверхі, дзе цэннік па акцыі можа дасягаць 1500 долараў за квадратны метр пры адначасовай аплаце. А самыя дарагія — на верхніх паверхах — да 2500 долараў за метр. Акцыя са зніжкамі працягнецца толькі да апошніх дзён мая.

Плюсам закрытага і цалкам кантраляванага відэакамерамі комплексу таксама стане адсутнасць гандлёвых і офісных памяшканняў на ніжніх паверхах жылых дамоў.

**Сяргей КУРКАЧ**






■ Прыемны факт

### НОВЫ САМАЛЁТ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**У флот авіякампаніі «Белавія» паступіў другі самалёт тыпу Боінг 737/800. Паветранае судна набыта ў аператыўны лізінг тэрмінам на пяць гадоў. Першы такі самалёт прыбыў у авіякампанію ў студзені і зараз ажыццяўляе рэгулярныя рэйсы ў найбольш аддаленыя пункты маршрутнай сеткі «Белавія» — Астану, Ашхабад, Тэль-Авіў.**

Як паведамілі ў «Белавія», падчас адпускнога сезона абодва самалёты плануецца выкарыстоўваць на найбольш запатрабаваных у гэты перыяд рэгулярных маршрутах: Барселона, Ларнака, Мілан, Рым і іншых. Плануецца выкананне чартарных рэйсаў на запатрабаваныя курорты.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ
**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН**

**на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения № 503а, площадью 13,8 м. кв.,**
**находящегося по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 05.06.2015 г. в 10.30 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Прием заявлений на участие принимаются до 17.00 02.06.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником предоставляется:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка размером 41 400 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 603 УНН 100650172, государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, не позднее 02.06.2015 года.

**Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.**

ОАО «Лидапищеконцентраты»
**сообщает, что 15 мая 2015 года в 13.30 в помещении актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**
УНП 500021268

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
**1. О внесении дополнения в решение годового общего собрания акционеров.**

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с материалами по повестке дня собрания с 08.05.2015 г. по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная секретаря руководителя) с 8.00. до 17.00, а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.
Регистрация участников собрания – с 13.00 до 13.25 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Страховой полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) № 059804 серия НВБ ЗАСО «Белнефтестрах» **считать недействительным.**

# КОЖНАЕ СЛОВА — СТРЭЛ, ТРАПНЫ РАДОК — КУЛЯМЁТНАЯ ЧАРГА

Слова клікала ў бой

## На востраве Зыслаў у гады вайны выйшла амаль сто нумароў падпольнай «Звязды»


Абеліск на востраве Зыслаў. Тут друкавалася «Звязда»-партызанка.

**Яшчэ Арыстоцель казаў, што самая моцная зброя чалавека — слова. Менавіта з дапамогай гэтага «інструмента» змагалася з гітлераўцамі і газета «Звязда» — адзінае рэспубліканскае выданне краіны, якое ў гады Вялікай Айчыннай вайны на працягу доўгага часу выходзіла ў тыле ворага.**

Напярэдадні свайго прафесійнага свята ў межах сумеснай ініцыятывы газет «Звязда» і «Мінская праўда», Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Мінскай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў «Слова клікала ў бой» мы пабывалі на Любаншчыне. Тут, у эпіцэнтры партызанскага руху Міншчыны, са студзеня 1943 года па ліпень 1944-га выйшла 98 нумароў «Звязды»!

## СЯРОД ЛЮБАНСКІХ БАЛОТ

Сёння на легендарным востраве Зыслаў, дзе размяшчаліся партызанскі штаб Мінскага падпольнага абкама і партызанскі аэрадром, выдаваліся газеты «Звязда», «Чырвоная змена» і раёнка «Кліч Радзімы», вельмі ціха і спакойна. Пра былое нагадваюць толькі помнікі і абеліскі, якія арганічна ўпісаліся ў лясны ландшафт. Вецер гойдае векавыя хвоі, шапацяць маладыя лісточкі яшчэ даваенных дрэў — быццам перагаворваюцца, узгадваючы тое, што тут было больш чым сем дзесяцігоддзяў таму.

Тут, у лесе, сваю выдавецкую дзейнасць газета «Звязда» працягвала пасля спынення выхаду ў Мінску. 26 верасня 1942 года гітлераўцы арыштавалі 21 падпольшчыка, сярод якіх быў і рэдактар газеты Вячаслаў Нікіфараў. Многія з іх былі жорстка закатаваныя. У партызанскай зоне газету аднаўляла новая каманда журналістаў-патрыётаў, якія кожны дзень віселі на валаску ад смерці.

Рэдактарам «Звязды» быў зацверджаны вопытны журналіст, даваенны рэдактар рэспубліканскай камсамольска-маладзёжнай газеты «Чырвоная змена» Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў. У рэдакцыйны калектыў увайшлі даваенны рэдактар любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец, былы супрацоўнік газеты «Советская Белоруссия» Георгій Шчарбатаў, а таксама дасведчаныя журналісты і паліграфісты Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка, Амяльян Шурпач і Ніна Цылько.

На маленькі востраў сярод любанскіх балот, дзе размясцілася рэдакцыя «Звязды», невялікую групу ўзброеных людзей вёў вопытны разведчык-следапыт — партызан Гальчэня. Акрамя аўтаматаў, яны неслі з сабой абсталяванне: чамаданы са шрыфтам, паперу, партатыўную друкавальную машынку.

## «ЗВЯЗДА» — ЯРКАЯ ЗОРКА Ў ЦЕМРЫ

27 студзеня 1943 года выйшаў першы нумар «Звязды» ў партызанскай зоне. Газета выходзіла два разы на тыдзень — у сераду і суботу, фарматам 1/8 друкаванага аркуша, накладам 500 экзэмпляраў.

Выданне выкрывала хлусліваю фашысцкую прапаганду, звярталася да працоўных з заклікамі аказваць дапамогу партызанам, як толькі можна: бязлітасна граміць нямецкія гарнізоны і калоны машын, захопліваць зброю гітлераўцаў і ёю іх жа біць. Сваім словам газета раіла мірным жыхарам як мага больш пасеяць азімых і яравых, папярэджвала, што трэба надзейна хаваць сабраны ўраджай, каб ім не завалодаў вораг. На яе старонках расказвалася пра падзеі на фронце, пра подзвігі народных мсціўцаў, паведамлялася аб выніках «рэйкавай вайны», аб дыверсіях найбольш актыўных груп, прапагандавалася авалоданне насельніцтвам падрыўной справай.

*«Партызаны і партызанкі! — заклікала газета ў нумары за 29 верасня 1943 года. — Мініруйце ўсе шляхі адходу нямецкіх войск. Пад адхон нямецкія эшалоны! У паветра аўтамашыны, танкі і гарматы праціўніка. Ірвіце сувязь і чыгуначнае палатно, нападайце на тылы, высочвайце і знішчайце штабы і склады гаручага і боепрыпасаў. Агнём і куляй сустракайце нямецкіх фашыстаў заўсёды і ўсюды!»*


Партызанскі лагер. Кветкі ад звяздоўцаў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Там, дзе пабывала «Звязда», адразу ж мяняўся настрой у людзей, панавала ўпэўненасць у перамозе над гітлераўцамі. Многія, хто трымаў у руках тагачаснае выданне, якое ўсяляла надзею ў светлую будучыню і хуткую перамогу, ішлі ў партызаны.

*— Наша «Звязда» ззяе яркай зоркай у цемры, — гаварыў жыхар вёскі Боркі Сцяпан Балвановіч сваім аднавяскоўцам. — Яна прынесла нам радасную вестку аб перамогах Чырвонай Арміі і заклік роднай Кампартыі да нас. Давайце, таварышы, дзейнічаць больш рашуча».* На наступны дзень, як у свет выйшлі гэтыя радкі, да народных мсціўцаў далучылася 15 чалавек з той жа вёскі.

Нягледзячы на тое, што ў лютым 1944 года ад тыфу памёр бясстрашны рэдактар «Звязды» Міхаіл Барашкаў і ад хваробы зляглі іншыя супрацоўнікі выдання, газета працягвала жыць. Апошні партызанскі нумар «Звязды» быў надрукаваны 1 ліпеня 1944 года ў Слуцку. Усяго за час выдання газеты ў партызанскай зоне ўбачыла свет 105 нумароў. Разам з вызваленнем у Мінск прыйшла і «Звязда». Яна зноў выйшла ў сталіцы 10 ліпеня 1944 года.

— Газета з'яўлялася прыкладам прафесійнага адлюстравання ваеннай рэчаіснасці для ўсяго беларускага друку, — лічыць **даследчык гісторыі беларускай журналістыкі, доктар гістарычных навук Алег СЛУКА.** — Яе публіцыстычныя матэрыялы былі напісаны жывой усхваляванай мовай, якая нікога не пакідала абыякавым. Кожнае слова — стрэл, трапны радок — кулямётная чарга, публіцыстычны вобраз — смерць ворагу! Такое крэда творчай працы было ў журналістаў-звяздоўцаў і ва ўсіх журналістаў Беларусі.

## СЛОВА МАЙСТРА

Словам змагаліся з ворагам і пісьменнікі. Ды і не толькі словам. Ганаровы грамадзянін і жыхар Любані, работнік культуры Беларусі, выдатнік друку Савецкага Саюза, лаўрэат прэміі Васіля Віткі пісьменнік Іван Муравейка Вялікую Айчынную вайну прайшоў ад першага дня да апошняга. Удзельнік абароны Масквы, Сталінградскай бітвы дайшоў да Берліна. І на матчынай мове распісаўся на рэйхстагу: «Я — Іван з Беларусі».



Іван МУРАВЕЙКА з маладымі ўдзельнікамі чытанняў.

Менавіта пад такой назвай летась у Івана Андрэевіча выйшла кніга. За апошнія 8 гадоў у паэта і празаіка — 8 кніг.

— Хто чытаў маю біяграфію, ведае, што сёлета мне спаўняецца 94 гады, але гэта няпраўда: мне больш за 100, бо год на фронце лічыцца за тры, — не без гумару пачаў свой аповед Іван Муравейка. — Нас засталося мала. Як мой сябар Сакалоў напісаў: «Жывымі помнікамі ходзім па адваяванай зямлі...»

**На маленькі востраў сярод любанскіх балот, дзе размясцілася рэдакцыя «Звязды», акрамя аўтаматаў, яны неслі з сабой абсталяванне: чамаданы са шрыфтам, паперу, партатыўную друкавальную машынку.**

Што мог прывезці пісьменнік з вайны? Вядома, друкавальную машынку, якую гвардыі старшы лейтэнант набыў восенню 1945 года ў Германіі. Гэты трафей, калі яго можна так назваць, Іван Муравейка перадаў у музей Тальскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа. Літаратурны салон створаны на малой радзіме Івана Андрэевіча: у вёсцы Таль, што непадалёк ад Любані. Тут захоўваюцца дакументы і граматы ветэрана, асабістыя рэчы пісьменніка, рукапісы яго твораў.

Іван Муравейка яшчэ працягвае пісаць. Слова для яго — як паветра. Да свайго 95-годдзя, якое ветэран адзначыць у наступным годзе, ён плануе выдаць яшчэ адну кнігу. Магчыма, туды ўвойдзе і гэты верш, які зарадзіўся ў галаве творцы зусім нядаўна:

*Салдат старанна выкапаў акоп*
*Уласную для абароны крэпасць.*
*Тры дні і ночы не глядзеў на неба,*
*Страчаў праклятых чужакоў у лоб.*

*Вакол акопа ворагі ляжаць*
*І танк варожы дымна дагарае,*
*А воін наш пад танкам памірае.*
*Хто стане знішчаны акоп шукаць?*

*А пахаванка скажа маме так:*
*«Сыночак ваш прапаў, прапаў без вестак».*
*Паплача дзень-другі нявеста,*
*А мама будзе ўсё жыццё чакаць.*

Сваім земляком на Любаншчыне лічаць і партызана, настаўніка, самабытнага пісьменніка Мікалая Жука. Нягледзячы на тое, што гэты чалавек нарадзіўся на Случчыне, ваяваў, жыў і працаваў ён менавіта на гэтай зямлі.

— У гады вайны былы студэнт літаратурнага аддзялення Мінскага педагагічнага інстытута, чые вершы ўжо пачалі з'яўляцца ў друку, апынуўшыся на акупаванай тэрыторыі, пайшоў у партызанскі атрад, — расказвае **бібліятэкар-бібліёграф Любанскай цэнтральнай бібліятэкі Ірына ГІЛЬ.** — Пасля вайны доўгі час працаваў у школе. Пісаў вершы, паэмы — пісаў пра тое, што перапаўняла яго сэрца. На жаль, Мікалай Андрэевіч так і не пабачыў сваіх кніг.

## ПАРТЫЗАНСКІ ФАЛЬКЛОР

Вершаваныя радкі нараджаліся ў акопе, канспіратыўнай кватэры, партызанскай зямлянцы. Сярод партызанаў Любанскага раёна было шмат майстроў слова. Вучні Сароцкай сярэдняй школы не толькі адшукалі літаратурную спадчыну сваіх землякоў, а і старанна даследавалі баявую паэзію партызанаў. У выніку выйшаў зборнік вершаў і песень паэтаў-партызанаў Любаншчыны «Дзённік суровага часу».

— Усё, што звязана з партызанскай гісторыяй, не павінна згубіцца, знікнуць, — упэўнены ўкладальнікі зборніка, вучні 10 класа Ілья Хмялеўскі і Вольга Шаплыка. — У сваёй працы мы не толькі канстатавалі вядомыя гістарычныя факты з гісторыі партызанскага руху Любаншчыны, а і імкнуліся знайсці як мага болей твораў паэтаў-партызанаў, у якіх яны адлюстроўвалі рэаліі вайны. Мы будзем працягваць збор паэтычных твораў, напісаных у гады Вялікай Айчыннай партызанамі нашага краю.

Партызанскі фальклор прапануем ацаніць і чытачам. Народныя мсціўцы былі сведкамі выдання падпольнай «Звязды». А можа, і мелі да гэтай справы нейкае дачыненне.

*Нам не забыць і з часам*
*Рэдакцыі куточак.*
*Адціскі, шрыфт і касу,*
*Важных навін радочак...*
*Было ўсё ў парадку,*
*Вось з гэтага паўстанка*
*Пускалі ў ход вярстанку*
*І Локаць, і Дастанка.*
*Калі была патрэба —*
*Парада або помач,*
*Рэдакцыю наведваў*
*Таварыш Кананові́ч.*
*Свая ў нас кананада,*
*Каб мела мір планета,*
*Мы білі немцаў-гадаў*
*Лістоўкай і газетай.*
*Раз конна прыскакалі*
*Да нас Казлоў і Бельскі:*
*На друкарах медалі*
*Заззялі, як пралескі.*

**(Я. Хатэнка.**
**Аб важным сховішчы)**

Зараджаліся на лясных палянах-сцежках і партызанскія прыпеўкі:

*Сядзіць Гітлер у Берліне,*
*Лічыць свае зубы*
*І калоціцца ад страху:*
*— Моцна б'ецца Любань.*

* * *

*Ах, які ў нас гармонік,*
*Залатыя галасы,*
*Немцы нос баяцца сунуць*
*У партызанскія лясы.*

Усё гэта, безумоўна, злавала ворага. Доўгі час фашысты не маглі паверыць, што на акупаванай тэрыторыі выдаецца бальшавіцкая газета. Гітлераўцы думалі, што іх дасылаюць з Масквы. Можна толькі ўявіць, якім жа было іх расчараванне, калі яны пераканаліся ў тым, што літаральна ў іх пад носам бясстрашныя людзі выдавалі газету.

Дарэчы, на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда», які адкрыецца сёння на выставе СМІ Беларусі, асобны раздзел будзе прысвечаны выданню газеты ў партызанскім краі на Любаншчыне. У чытачоў з'явіцца магчымасць не толькі пачуць пра востраў Зыслаў і журналістаў-патрыётаў, а і пабачыць гэтыя мясціны, дакрануцца да гісторыі стварэння нашай «Звязды» і пераканацца ў тым, што і сёння там захоўваецца памяць аб геройчных справах партызанаў на любанскай зямлі.

**Вераніка КАНЮТА,**
*Любанскі раён.*

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 4 (12)



■ Памяць



# «КАЛІ МНЕ БЫЛО 16...»

**У ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, палкоўніка міліцыі ў адстаўцы Фёдара Малахавіча Супрановіча шмат цікавых успамінаў. Седзячы перада мной, ён разгортвае вялікую кнігу, прысвечаную партызанам, яго баявым таварышам, і нетаропка пачынае сваю гісторыю.**

## ЗДРАДНІК ПА ІМЕНІ ДАВІД

Вайну Фёдар сустрэў у 16-гадовым узросце. Спачатку вучыўся ў роднай вёсцы Касцюкі, што на Барысаўшчыне, пасля — у Зембіне, але ўсе планы хлопца перапыніла вайна, прымусіла адаптавацца да зусім іншай рэчаіснасці. У першыя дні яго ўключылі ў знішчальны камсамольска-маладзёжны атрад для барацьбы з дыверсантамі, выдалі зброю ды наказалі хлопцу з таварышам сцерагчы мост праз Бярэзіну. Неўзабаве да іх пад'ехаў Давід Эгаф, школьны настаўнік нямецкага паходжання, які спрабаваў выехаць на Барысаў. Ён вельмі доўга ўгаворваў, каб яго прапусцілі, але хлопцы трымаліся загада. Якім жа было здзіўленне ў мясцовых жыхароў, калі пазней разам з атрадам карнікаў у нямецкай форме з'явіўся той самы настаўнік Давід. Выпытваў, хто забіў салдатаў і нямецкага афіцэра і, зразумела, не забыўся пра Фёдара, якога любіў з-за прычоскі называць Карлам. «А дзе Карл?» — спытаў у жыхароў Касцюкоў Эгаф. «А Карла ў нас няма, — адказаў яму стараста. — Ёсць толькі Карп, але ён ужо стары і хворы». У выніку тады расстралялі 18 чалавек, але Супрановіч





здолеў захаваць жыццё. Ён уладкаваўся на торфапрадпрыемства, што забяспечвала палівам электрастанцыю ў Барысаве.

Неяк у лесе, непадалёк ад месца працы, сустрэў двух аўтаматчыкаў, якія прадставіліся байцамі асобнай мотастралковай брыгады асаблівага назначэння. Яны збіраліся знішчыць з паплечнікамі нямецкі гарнізон, і ім неабходна была дапамога. Супрановіч пачаў збіраць інфармацыю, увайшоў у давер да начальніка прадпрыемства. «Я запамінаў усё, што бачыў, — узгадвае суразмоўца, — колькасць зброі, як выглядалі памяшканні. Літаральна ўсё». У выніку 31 ліпеня 1942 года гарнізон знішчылі, а Віктар Бальшакоў, былы начальнік штаба партызанскай брыгады «дзядзькі Колі», пасля ў сваіх успамінах адзначаў, што вялікую дапамогу ў гэтай справе аказаў «рабочы торфазавода Фёдар Малахавіч Супрановіч».

## ЗАДАЧА — ЗАВЕРБАВАЦЬ ПАЛІЦАЯЎ

Партызаны паручылі Супрановічу яшчэ адно заданне: пераманіць на свой бок паліцаяў, якія сталі служыць фашыстам не па сваёй ахвоце. «Я ўвесь час праводзіў сярод іх. І мясцовыя жыхары мне нават казалі: «Ну, Федзя, дагуляешся. Заб'юць цябе партызаны за дапамаганне немцам». Праз пэўны час Супрановічу прыйшло паведамленне аб тым, што яго забіраюць на працу ў Германію. Партызаны ў выніку прапанавалі перайсці да іх у слаўтую брыгаду «дзядзькі Колі», у якую ён потым прывёў 17 былых паліцаяў з боепрыпасамі. Так Супрановіч апынуўся ў атрадзе імя Чапаева. Ён актыўна ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, разам з іншымі спусціў з рэек варожы эшалон. Выдатна страляў з кулямёта. Некалькі разоў атрымліваў раненні. «Я быў адным з самых маладзейшых у атрадзе, — кажа Фёдар Малахавіч. — Сярод нас больш было людзей сталых, якім пашанцавала вырвацца з палону».

Самым складаным днём вайны для брыгады Фёдар Малахавіч называе 26 чэрвеня 1944 года, калі немцы чарговы раз спрабавалі акружыць партызанаў. «У гэты дзень па-геройску загінулі 164 байцы. Параненых мы схавалі ў дрыгве, прыкрылі травой. Але фашысты з сабакамі знайшлі ўсіх і забілі. А нашу радыстку Надзю Качаргу прывязалі да дрэва, афіцэр выпусціў у яе сем куль, але яна выжыла. І мы двойчы пасля сустракаліся з ёй на партызанскіх сустрэчах». Параненага Фёдара накіравалі ў шпіталь у Арэхава-Зуева, а пасля адправілі радыстам на Далёкі Усход ваяваць з Японіяй. Там ён аказаў дапамогу ў затрыманні японскага генерала, быў паранены. За гэту вайну Супрановіч атрымаў падзяку ад Іосіфа Сталіна за вызваленне Маньчжурыі.

## МІРНАЕ ЖЫЦЦЁ

Фёдар Малахавіч доўга служыў у органах унутраных спраў, адказваў за тэхнічныя сродкі аховы аб'ектаў народнай гаспадаркі. Пэўны час працаваў нават намеснікам начальніка тагачаснага дэпартамента аховы. А цяпер пры магчымасці сустракаецца з маладым папаўненнем міліцыі, дзеліцца ўспамінамі са школьнікамі, удзельнічае ў мерапрыемствах, што праводзіць МУС Беларусі. На парад сёлета не пойдзе, але абавязкова ў святочны дзень надзене пінжак, упрыгожаны 34 ордэнамі і медалямі, адзначыць свята дома, сярод сваіх блізкіх сваякоў і ўзгадае баявых таварышаў, што загінулі ў тым страшным пекле, так і не дачакаўшыся Дня Перамогі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара**

■ Да ведама

# Стаць вадзіцелем па новых правілах

**З 26 красавіка зменены парадак прыёму кваліфікацыйных іспытаў на правы кіравання механічным транспартам, паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС РБ.**

Так, да 6 месяцаў павялічылі тэрмін, на працягу якога курсант, што здаў тэорыю, дапускаецца да практычнага экзамену. Для тых, хто не здаў тэарэтычны іспыт (альбо адзін з этапаў практыкі) з трэцяй і наступных спроб, паўторны экзамен назначаецца не раней, чым праз 30 дзён.

Калі навучэнец не падаў экзаменацыйную картку па ўсіх іспытах у рэгістрацыйна-экзаменацыйнае падраздзяленне, каб атрымаць вадзіцельскае пасведчанне, на працягу трох гадоў, прыйдзецца іспыты перездаваць.

Пры прыёме практычнага экзамену на другім этапе можна выкарыстоўваць навігатар. Рашэнне аб яго выкарыстанні прымае старшыня камісіі па згодзе з экзаменатарамі. Член камісіі перад пачаткам экзамену будзе ўносіць выпрабавальны маршрут у навігатар. Апеляцыю можна падаваць толькі аднойчы. Паўторная разгляду не падлягае.

# Спяшаліся... на той свет

**За тры месяцы з удзелам матацыклістаў здзейснена 26 дарожна-транспартных здарэнняў. У выніку 6 чалавек загінулі і 25 атрымалі пашкоджанні. Пяць смяротных выпадкаў, як падкрэсліла Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асобых даручэннях упраўлення ДАІ МУС РБ, адбылося непасрэдна ў красавіку!**

Так, 22-га ў Баранавічах мясцовы жыхар на матацыкле «Сузукі» сутыкнуўся з аўтамабілем «Аўдзі», які рухаўся ў спадарожным кірунку. Матацыкліст памёр на месцы здарэння. Яшчэ адна трагедыя адбылася ў Асіповічах, дзе хлопец наляцеў на «МАЗ». Матацыкліста шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне мясцовай бальніцы, аднак выратаваць жыццё не атрымалася. Абодвум загінулым не споўнілася і 25 гадоў...

Дзяржаўтаінспекцыя настойліва папярэджвае, што да падобных сумных вынікаў даволі часта прыводзіць ліхацтва гаспадароў мататэхнікі. Разам з адсутнасцю навыкаў ваджэння «гоншчыкаў» і няўважлівасцю аўтамабілістаў гэта прыводзіць да немінучай трагедыі. ДАІ просіць кіроўцаў матацыклаў выконваць правілы дарожнага руху (хуткасныя рэжымы, правілы манеўравання) і, безумоўна, выкарыстоўваць шлемы. Уладальнікі мапедаў і матацыклаў таксама мусяць памятаць аб абавязковым дзённым руху з уключаным блізкім святлом фар. Не лішне будзе апрануць камізэльку ці іншую вопратку павышанай бачнасці са святлоадбівальнымі ўстаўкамі, каб быць больш заўважнымі для астатніх удзельнікаў дарожнага руху.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Навіны 102

# «УКРАЎ» АСАБІСТУЮ МАШЫНУ ДЗЕЛЯ СТРАХОЎКІ

**Для атрымання страхавой выплаты мінскі таксіст арганізаваў крадзеж і знішчэнне асабістага аўтамабіля. Пра гэта паведамляе прэс-служба ўпраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама.**

У сярэдзіне сакавіка 31-гадовы індывідуальны прадпрымальнік з Бараўлян паведаміў у Мінскае РУУС, што ў яго скралі аўтамабіль «KIA Rio» 2013 года выпуску. Як патлумачыў мужчына, два тыдні таму ён згубіў ключы ад машыны каля магазіна непадалёку ад свайго дома. Відавочна, той, хто іх знайшоў, і выкраў «жалезнага каня».

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што машына застрахавана заяўнікам на 18 тыс. долараў ЗША. Адной з версій было меркаванне, што грамадзянін спрабуе здзейсніць так званае «страхавое махлярства»: рыначны кошт прапажы на той момант не перавышаў 10 тыс. долараў. Між іншым, апошнія некалькі месяцаў гаспадар спрабаваў прадаць аўто, каб сплаціць доўг у 7 тыс. долараў.

Аднак кошт машыны за гэты час упаў больш як удвая. Тады кіроўцу прыйшла ідэя атрымаць страхавую выплату. Ён звярнуўся да знаёмых таксістаў і прапанаваў ім скрасці транспартны сродак. Клапатлівы гаспадар нават паклаў у багажнік каністру з бензінам. За ўзнагароджанне ў 500 долараў прыяцелі адагналі машыну ў лес і спалілі.

Усе ўдзельнікі злачыннай змовы ўжо далі прызнальныя паказанні. У дачыненні заяўніка заведзена крымінальная справа па арт. 400 Крымінальнага кодэкса (заведама ілжывы данос). Працягваецца далейшае расследаванне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# УЗЯЎ ГРОШЫ НА ЗАХОЎВАННЕ. З «КАНЦАМІ»...

**У Партызанскі РУУС г. Мінска звярнуўся 57-гадовы мінчанін з заявай аб крадзяжы ў яго 14 тысяч долараў, выручаных ад продажу кватэры. А гісторыя здарылася такая...**

— Грамадзянін выйшаў з лячэбна-працоўнага прафілакторыя і вырашыў пачаць новае жыццё. Пакуль працаўладкавацца не атрымлівалася, ён, каб было на што жыць, прадаў адну з дзвюх кватэр, якія меў. Прычым доўга не таргаваўся і аддаў яе першым жа пакупнікам за 27 тысяч долараў. Тыя, дарэчы, неўзабаве перапрадалі кватэру практычна ўдвая даражэй, — паведаміла **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС сталіцы Ганна ГАНУСЕВІЧ.** — Атрыманымі сродкамі мужчына вырашыў падзяліцца з ранейшай сям'ёй: колішняй жонцы аддаў 10 тысяч долараў, сыну — 3 тысячы. Адзначаючы з чарговым таварышам продаж кватэры і пачатак новага жыцця, грамадзянін пахваліўся наяўнасцю 14 тысяч «зялёных». Візаві, як добры чалавек, тут жа прапанаваў паслугі па захаванні грошай, маўляў, нават сейф мае дома. Наш герой паверыў сабутэльніку і аддаў яму долары. Як высветлілася, бачыў іх ён тады апошні раз...

Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі месцазнаходжанне асобы, якая злоўжыла даверам прадаўца кватэры. Гэта быў 30-гадовы мінчанін. На момант затрымання ён ужо паспеў патраціць усю суму, атрыманую для захоўвання. Цяпер яму пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАКАРАННЕ НА ДВАІХ

**Разам з кіроўцам, па віне якога ў «п'янай» аварыі загінулі людзі, адказнасць панёс і... былы ўладальнік аўто.**

Трагедыя ў Мінску адбылася летась. Сярод белага дня на прыпынак грамадскага транспарту выскачыў аўтамабіль «БМВ», ламаючы на сваім шляху ўсё жывое. 61-гадовая жанчына загінула на месцы, а 67-гадовы мужчына памёр неўзабаве пасля дастаўлення ў бальніцу. За рулём «звар'яцелага» аўто знаходзіўся 22-гадовы жыхар Шклова нападпітку. Маладога чалавека ўжо двойчы пазбаўлялі правоў за «п'янку», але ён ніякіх высноў не зрабіў: на момант страшнай аварыі ў яго крыві было 1,7 праміле алкаголю.

— Малады чалавек панёс пакаранне адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса, — паведаміла **інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вольга ВЯРШУБСКАЯ.** — Аўтамабіль канфіскаваны ва ўласнасць дзяржавы, а кіроўца на бліжэйшыя 8 гадоў адправіцца ў турму. Акрамя гэтага, да адказнасці прыцягнуты яшчэ адзін чалавек, які за пару месяцаў да аварыі прадаў абвінавачанаму сваю машыну па даверанасці. Ён павінен выплаціць пацярпелым 250 мільёнаў рублёў маральнай кампенсацыі. У сувязі з гэтым на яго аўтамабіль «Хонда Акорд» і зямельны ўчастак накладзены арышт. Без віны вінаватым ён стаў толькі таму, што пры продажы аўтамабіля не аформіў неабходных дакументы ў Дзяржінспекцыі і адпаведныя змены не былі ўнесены ў базы звестак. На момант здарэння аварыі менавіта ён з'яўляўся афіцыйным уладальнікам машыны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



# ПАРКУЙСЯ ПРАВІЛЬНА І ЖЫВІ СПАКОЙНА

**Чым больш у сталіцы аўтатранспарту, тым менш для яго месца. Недахоп стаянак і парковак у Мінску — праблема вядомая. Але абвінавачваць ва ўсіх заганах даўнішніх планіроўшчыкаў не трэба. Даволі часта самі аўтамабілісты робяць усё дзеля таго, каб убачыць сваю машыну на штрафстаянцы. Журналісты «Звязды» зафіксавалі, як на мінскіх вуліцах працуюць эвакуатары аўтатэхнікі.**

Вуліца Рафіева. Раніца працоўнага дня. Здавалася б, усе ў гэты час павінны быць на рабоце, аднак машын у дварах як грыбоў пасля дажджу, — процьма! Аўтамабілямі застаўлена літаральна ўсё. Вольных месцаў сапраўды няшмат.

— Пры забудове гэтага раёна ніхто не ўлічваў, што з часам аўтатранспарту стане больш, — кажа **Іван ТАРГОНЯ, старшы інспектар дарожна-патрульнай службы аддзела ДАІ Маскоўскага РУУС.** — Нявхатка паркавачных месцаў — адна з асноўных праблем спальных раёнаў сталіцы.

Кандыдаты для эвакуацыі на штрафстаянку тут у кожным двары. Але ўсіх, безумоўна, не аштрафуеш. Супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі разам з кіроўцам эвакуатара працуюць з 8 да 17 гадзін і за дзень, па статыстыцы, эвакуіруюць каля 10 машын.

Прычыны, якія прымушаюць забіраць аўтамабіль, а гаспадару выпісваць штраф, вядомы кожнаму. Адзін кінуў машыну на тратуары, другі — заблакіраваў уезд у двор, а трэці наогул аказаўся самым нахабным — заехаў на газон і пакінуў пасля сябе глыбокія сляды ад колаў, якія надоўга застануцца на зялёнай зоне.

Пакуль Яўген Каласоўскі, кіроўца эвакуатара, рыхтуецца ўзняць з тратуара і ўстанавіць на платформу чорную іншамарку, нашу са старшым інспектарам размову перарывае мясцовы жыхар.

— Ведаеце, яны ўжо проста «дасталі»! — вельмі эмацыйна скардзіцца на аўтамабілістаў пажылы мужчына. — Кідаюць машыны там, дзе ім хочацца. Рэжуць пратэктарамі ўвесь газон. Такім нядбайным кіроўцам на машыны трэба наклейкі маляваць!

***— Іван Адамавіч, а ці прыходзіцца вам выязджаць па выкліках жыхароў?***

— З просьбамі эвакуіраваць машыну нам даволі часта тэлефануюць мясцовыя жыхары. Напрыклад, калі нехта падпёр чужы аўтамабіль, заблакіраваў праезд смеццявозу ці перашкаджае гуляць людзям па тратуары.

Цікава, што падобныя сітуацыі даволі часта вадзіцелі вырашаюць самі. Яны пакідаюць пад лабавым шклом свой кантактны нумар, каб той, каму замінае машына, мог у любы момант паведаміць яму аб гэтым. Парадокс у тым, што па гэтых нумарах часам тэлефануюць... самі інспектары ДАІ, каб кіроўца прыйшоў, адагнаў аўто і атрымаў квітанцыю.

Дарэчы, пагрузка аўтамабіля на эвакуатар вымагае запаўнення дакументацыі. Напрыклад, трэба абавязкова выпісаць усе пашкоджанні машыны, каб пасля ўласнік не прычапіўся да нейкіх «новых драпін».

На штрафстаянцы па вуліцы Напалеона Орды, куды эвакуіруем аўтамабіль, чакаюць сваіх гаспадароў яшчэ некалькі машын. Усё ж такі большасць вадзіцеляў ці іх даверыных асобы прыбягаюць за імі адразу, аднак ёсць і тыя, хто не спяшаецца па сваю маёмасць на колах. Некаторыя машыны могуць завіснуць тут на некалькі тыдняў.

***— Як паводзяць сябе вадзіцелі, калі даведваюцца, што іх транспартны сродак эвакуіравалі?***

— 80 працэнтаў вадзіцеляў ставяцца спакойна, бо разумеюць, што парушылі закон. А астатнія пачынаюць спрачацца, пры складанні пратакола кажуць, што аўто не было дзе прыпаркаваць. Дарэчы, калі вы не знайшлі сваёй машыны, тэлефануйце 102. Вам паведамяць аб яе месцазнаходжанні. На многіх эвакуацыя дзейнічае даволі станоўча. Калі чалавек бачыць, як на штрафстаянку забіраюць суседнюю машыну, ён міжволі задумваецца аб тым, каб не парушаць правілы паркоўкі.



**Прычыны, якія прымушаюць забіраць аўтамабіль, а гаспадару выпісваць штраф, вядомы кожнаму. Адзін кінуў машыну на тратуары, другі — заблакіраваў уезд у двор, а трэці наогул аказаўся самым нахабным — заехаў на газон і пакінуў пасля сябе глыбокія сляды ад колаў, якія надоўга застануцца на зялёнай зоне.**

Праз хвілін 20 мы зноў на вуліцы Рафіева. Новага пасажыра эвакуатару доўга шукаць не прыйшлося. На тратуары, непадалёк ад увахода ў краму, прыпаркаваўся ўладальнік чорнага «Фольксвагена». Праўда, кіроўца знаходзіўся на месцы, а таму эвакуіраваць аўто не спатрэбілася. Як аказалася, гэты мужчына ўжо не ў першы раз пападаецца за здзяйсненне правапарушэнняў.

— Стабільнасць — прыкмета майстэрства, — у размове пра чарговы штраф з Іванам Таргонем спрабуе аджартавацца засмучаны аўтамабіліст.

***— А ці не прасцей вадзіцелям пакідаць машыну на працяглы час не ў двары, а на платнай стаянцы, каб не рызыкаваць?*** — пытаюся пасля ў Івана Таргоні.

— Я так і раблю. Плачу за машына-месца 240 тысяч у месяц. І гэта ў любым выпадку менш за тую суму, якую выплачвае кіроўца пасля паўторнага парушэння.

Зразумела, лічыць працу эвакуатара панацэяй ад праблем, звязаных з паркоўкай, нельга. Вядома, задачы тут крыху іншыя. А вось паменшыць колькасць тых, хто абы-як кідае сваё аўто, перашкаджае тым самым астатнім, цалкам верагодна. Тым больш, як кажа Іван Таргоня, пасля першага штрафу за няправільную паркоўку многія паводзяць сябе больш дысцыплінавана і паўтараць старыя памылкі не збіраюцца.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

## ЭВАКУАТАР ЦЯПЕР «ПРАЦУЕ» І ЎНАЧЫ

**Супрацоўнікі ДАІ Цэнтральнага раёна г. Мінска ў рамках кантролю за захаваннем кіроўцамі правіл спынення і стаянкі арганізуюць работу з прыцягненнем эвакуатара ў начны час сутак.**

— Да нас усё часцей сталі прыходзіць звароты ад жыхароў раёна з просьбай навесці парадак на дваровай тэрыторыі. У ДАІ прааналізавалі іх і вырашылі, што мэтазгодным будзе прыцягваць эвакуатар не толькі ўдзень, але і ўначы. Безумоўна, у сілу абставін кожны дзень і па ўсім раёне праводзіць такія рэйды не ўяўляецца магчымым, але дзякуючы неабыякавым грамадзянам будзе прасцей вызначыць самыя праблемныя месцы, — расказалі ў прэс-службе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Супрацоўнікі ДАІ папярэджваюць: цяпер, перш чым пакінуць свой аўтамабіль на «начоўку» там, дзе зручна кіроўцу (нават у парушэнне правілаў), падумайце! Штраф за парушэнне правіл спынення і стаянкі складзе 180 тысяч рублёў пры першым правапарушэнні і 360 тысяч — пры паўторным. Прымусовая адбуксіроўка (эвакуацыя) транспартнага сродку на ахоўную стаянку з поўнай пагрузкай на эвакуатар будзе каштаваць 430 тысяч рублёў, з частковай пагрузкай на эвакуатар — 380 тысяч. Захоўванне аўтамабіля, які быў прымусова эвакуіраваны на ахоўную стаянку, цягам 1-3 сутак абыдзецца ў 60 тысяч рублёў за суткі, ад 4 да 10 сутак — у 35 тысяч за кожныя суткі, а вось ужо з 10-х сутак — па 25 тысяч за кожныя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Надзённае пытанне

# ВЕЛАСІПЕД ТРЫМАЙЦЕ «ПАД КЛЮЧОМ»

**З гэтага нумара «Фарпоста» мы распачынаем новую рубрыку. У рамках яе, паважаныя чытачы, на вашы тэматычныя пытанні будуць адказваць супрацоўнікі міліцыі. Дасылаць іх можна на электронную пошту zhurnalist155@gmail.com. А сёння прадстаўляем вашай увазе першыя адказы.**



**— У майго знаёмага нядаўна з пад'езда шматкватэрнага дома скралі веласіпед. Пасля гэтага я пачаў захоўваць свой у кватэры. Падкажыце, калі ласка, дзе найчасцей крадуць веласіпеды і як ад гэтага наогул абараніцца?**

**(Андрэй П.,** *Мінск***).**

На пытанне далі адказ у арганізацыйна-аналітычным упраўленні міліцыі грамадскай бяспекі МУС РБ.

— У першым квартале 2015 года зарэгістраваны 562 падобныя крадзяжы. Пры гэтым ільвіная доля ўкрадзеных ровараў была пакінута без нагляду, без блакіруючых прылад на вуліцы ці ў грамадскіх месцах. Напрыклад, 182 веласіпеды скралі менавіта з пад'ездаў. Часта незаблакіраваныя замкамі веласіпеды крадуць з лесвічных пляцовак пад'ездаў, з двароў і прыватных дамоў. А вось колькасць крадзяжоў велатранспарту, уладальнікі якога выкарыстоўвалі замкі альбо захоўвалі іх у замкнутых памяшканнях, меншая ў некалькі разоў. Супрацоўнікі арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў раяць для захоўвання падобнай тэхнікі выбіраць замкнёныя памяшканні, а калі ўсё ж такі пакідаеце веласіпед на вуліцы, карыстайцеся велазамком. Фіксуйце да агароджы не толькі раму, але і кола. Безумоўна, лепш выкарыстоўваць два замкі розных відаў: напрыклад, тросавы ці U-падобны. Пры выбары месца для паркоўкі веласіпеда аддавайце перавагу месцам, якія знаходзяцца ў зоне дзейнасці камер відэаназірання.

**— Звяртаюся да вас вось па якой справе. Мой сусед арганізаваў цэлы цэх па выпуску самагоннай брагі. Канчатковы прадукт выпівае сам, а таксама прадае суседзям, сябрам. Якая ў нас прадугледжана за гэта адказнасць і куды можна звярнуцца з падобнай інфармацыяй?**

**(Н. Е.,** *Нясвіжскі раён***).**

Па словах Дзмітрыя Кур'яна, намесніка начальніка ўпраўлення аховы правапарадку Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС РБ, органы і падраздзяленні ўнутраных спраў надаюць першаснае значэнне спыненню самагонаварэння і незаконнаму распаўсюджванню спіртавых напояў. З аднаго боку, парушаецца дзяржаўная манаполія на выраб і рэалізацыю алкаголю, а з другога — падрываецца фізічны і маральны стан чалавека. Ад выпадковага атручэння сурагатным алкаголем кожны год гінуць дзясяткі людзей. Міліцыянеры пастаянна знаходзяць і знішчаюць сапраўдныя міні-заводы па выпуску моцных напояў. У гэтай працы праваахоўнікам часта дапамагаюць грамадзяне. Ва ўсіх рэгіёнах краінах арганізавалі кругласутачныя «гарачыя лініі» «П'янству — не!», куды можа звярнуцца любы ахвотны, паведаміць пра факты незаконнага вырабу, абарачэння алкагольнай прадукцыі. З пачатку года паступіла ўжо некалькі сотняў падобных званкоў, большая частка з якіх пацвердзілася.

Сёлета ў Беларусі канфіскавалі больш за 660 самагонных апаратаў, каля 250 тысяч літраў самагону і брагі, за незаконнае абарачэнне алкагольнай прадукцыі да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі больш за 4 тысячы чалавек.

За выраб і набыццё самагону, захоўванне апаратаў для яго вытворчасці прадугледжаны штраф да 5 базавых велічынь. Паўторнае правапарушэнне на працягу года прынясе за сабой штраф да 30 базавых. А вось рэалізацыя алкагольных напояў, у тым ліку ўласнага прыгатавання, карaецца штрафам ад 5 да 20 базавых велічынь з канфіскацыяй прадукцыі. Калі маеце падобную інфармацыю, можаце патэлефанаваць на «гарачыя лініі» «П'янству — не!»: **Упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага (80162 45 62 15), Віцебскага (8-0212 58 08 63), Гомельскага (80232 46 44 44), Гродзенскага (80152 79 73 33), Мінскага (8-017 207 67 02), Магілёўскага (8-0222 29-50-95) аблвыканкамаў, ГУУС Мінгарвыканкама (8-017 270 55 01).**

**Якаў ЖУРБІН**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

| Наименование продавца (балансодержателя) | Номер лота | Наименование объекта торгов, краткие характеристики | Местонахождение | Условия продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. без учета НДС | Задаток, бел. руб. | Дата проведения аукционных торгов, время | Последний день подачи заявления для участия в торгах |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ОАО «Брестоблгарант» | 1 | Капитальное строение (инв. №130/С-30857) – административно-торговое здание, общ. пл. 269,4 м², расположенное на земельном участке, пл. 0,0585 га | Брестская обл., г. Пинск, ул. Завальная, 21 | без условий | 1 348 242 137 | 134 824 214 | 19 мая 2015 г. в 11.00 | 18 мая 2015 г. |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Место проведения аукционных торгов: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Контактные телефоны организатора аукционных торгов: 8-(0162)- 23-92-59, 21-88-81.**
***Перечень документов, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, находится в объявлении, опубликованном в газете «Звязда» от 24.02.2015 года.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212)37-89-72

Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества. Целевое использование.

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 195,4 кв.м, расположенных на 1-м этаже и в подвале капитального строения с инвентарным №200/С-56147 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Космонавтов, 8 (здание железнодорожного вокзала). Размер ежемесячной арендной платы составляет 175,86 базовой арендной величины. Целевое использование: для оказания услуг общественного туалета. **Начальная цена:** 5 862 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 586 200 белорусских рублей.

Дата, время и место проведения аукциона: 05.06.2015 в 12.00. г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи документов: с 05.05.2015 с 8.30. по 04.06.2015 до 16.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. **Контактные тел: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

Белорусский Банк Малого Бизнеса

Закрытое акционерное общество
«Белорусский Банк Малого Бизнеса»

**bbsb.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 апреля 2015 года

Закрытое акционерное общество «Белорусский Банк Малого Бизнеса»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | на 1 апреля 2015 | на 1 апреля 2014 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | |
| 2 | Денежные средства | 2 143 | 16 772 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 54 006 | 79 221 |
| 5 | Средства в банках | 37 354 | 13 040 |
| 6 | Ценные бумаги | | |
| 7 | Кредиты клиентам | 65 | 244 628 |
| 8 | Производные финансовые активы | | 37 801 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | | |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1 608 | 4 188 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | | |
| 12 | Прочие активы | 1 012 | 2 151 |
| 13 | ИТОГО активы | 96 188 | 397 801 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| 15 | Средства Национального банка | | 23 680 |
| 16 | Средства банков | 151 | 89 045 |
| 17 | Средства клиентов | 1 454 | 199 914 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | | |
| 19 | Производные финансовые обязательства | | 96 |
| 20 | Прочие обязательства | 4 045 | 1 418 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 5 650 | 314 153 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | |
| 23 | Уставный фонд | 71 390 | 71 390 |
| 24 | Эмиссионный доход | | |
| 25 | Резервный фонд | 5 524 | 236 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1 692 | 3 480 |
| 27 | Накопленная прибыль | 11 932 | 8 542 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 90 538 | 83 648 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 96 188 | 397 801 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01 апреля 2015 года

Закрытое акционерное общество «Белорусский Банк Малого Бизнеса»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | на 1 апреля 2015 | на 1 апреля 2014 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Процентные доходы | 1 701 | 11 697 |
| 2 | Процентные расходы | 1 | 4 086 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 1 700 | 7 611 |
| 4 | Комиссионные доходы | 280 | 2 702 |
| 5 | Комиссионные расходы | 67 | 240 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 213 | 2 462 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | | |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 14 982 | 3 589 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | | 1 327 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | -214 | 823 |
| 12 | Прочие доходы | 29 | 407 |
| 13 | Операционные расходы | 3 149 | 10 187 |
| 14 | Прочие расходы | 24 | 63 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 13 965 | 4 323 |
| 16 | Налог на прибыль | 3 967 | |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 9 998 | 4 323 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | |

Председатель Правления Т.М.Медведева

Главный бухгалтер А.Н.Бельник

ЗАО «Банк ББМБ» зарегистрирован НБ РБ 28 августа 2008 года, регистрационный номер 119. УНП 807000201

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ
**Государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь**

## ПРОВОДИТ АУКЦИОН

**на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения № 3, площадью 19,6 м. кв.,**
**находящегося по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5/1.**

**Аукцион состоится 05.06.2015 г. в 10.00 в ауд. 416 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Заявления на участие принимаются до 17.00 02.06.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участником предоставляется:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка размером 58 800 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 603 УНН 100650172, государственное учреждение «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, не позднее 02.06.2015 года.

**Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.**

УНН 100650172

Утерянную печать жилищно-строительного потребительского кооператива «Защитник» г. Минск УНП 190993806 **считать недействительной** с 08 января 2015 года.

# Управляющий по делу о банкротстве ПРУП «Гродноэнергосбережение» № 48-3б/2014 от 05.08.2014 сообщает о продаже на торгах имущества должника:

**Сведения об организаторе торгов:** **Частное предприятие по антикризисному управлению «НисаБел», Директор – Бойкова Наталья Николаевна 230023, г. Гродно, а/я 174, тел.: 8 (029) 866-10-00 (МТС), 8(0152)72-11-73 (оф.).**

**Сведения о продавце:** **Производственное республиканское унитарное предприятие «Гродноэнергосбережение» Адрес: 230003, г. Гродно, пр-т Космонавтов, 60В (УНП 590004154), тел.: 73-05-27**

**Форма, дата, время и место проведения торгов:** **Торги проводятся в форме аукциона 10.06.2015 года в 12.00 по адресу: 230003, г. Гродно, пр-т Космонавтов, 60В** Порядок проведения торгов, оформления участия в них и их результата установлен в ст.ст. 128-129 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

**Порядок ознакомления с имуществом, являющимся предметом торгов:** До окончания срока приема заявок на участие в торгах можно ознакомиться с информацией об имуществе, составляющем предмет продажи (пн.–пт. с 9.30 до 17.00) по адресу: 230003, г. Гродно, пр-т Космонавтов, 60В.

**Предмет торгов и начальная цена имущества:** Начальная цена имущества-предмета торгов (с учётом НДС):

| № п/п/ | Наименование имущества | Стоимость в белорусских рублях (с учётом НДС) |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль легковой «КИА MAGNETIS» | 85 378 000 |
| 2 | Газоанализатор «Тесто-335» в комплекте | 24 333 600 |
| 3 | Генератор EUROPOWER сварочный EP 200 X-HS200AD | 18 000 200 |
| 4 | Грузовой автомобиль «Фиат Дукато» | 64 149 000 |
| 5 | Механизм листогибочный И2222Б | 34 713 600 |
| 6 | Ножницы кривошипные листовые с поперечной резкой листа НА 3221 б/у | 44 286 000 |
| 7 | Ножницы листовые | 22 545 600 |
| 8 | Станок вертикально-фрезерный 6Р12 | 20 366 400 |
| 9 | Станок радиально-сверлильный 2М-55 | 24 156 000 |
| 10 | Тепловизор SAT S-280 | 23 240 400 |
| 11 | Установка компрессорная ВК-10-10-500Д | 31 231 200 |

Цена имущества установлена посредством независимой экспертной оценки.

**Шаг аукциона:** 5% от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях

**Правила подачи заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов:**
Заявление на участие в аукционе в срок **до 08 июня 2015 года до 00.00.** директору ЧУП «НисаБел» Бойковой Н.Н. по адресу: 230023, г. Гродно, а/я 174.
К заявлению на участие в торгах прилагаются следующие документы:
- заверенный банком документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуальных предпринимателей – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования) – для юридических лиц;
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенность, оформленная в соответствии с законодательством;
- для гражданина Республики Беларусь – документ, удостоверяющий личность.
Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

**Размер, порядок и сроки внесения задатка:** Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе и 5% от начальной цены объекта. Копия платежного поручения прилагается к заявлению.
Платёж вносится на р/с 3012140195051 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226. Назначение платежа: «задаток за участие в аукционе».
Сумма внесенного победителем торгов задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному на торгах.
Участникам, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
В случае отказа или уклонения победителя торгов от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, внесенный им задаток возврату не подлежит и включается в состав имущества должника. Победитель торгов определяется в соответствии со ст. 128 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

**Срок возможного отказа организатора от проведения торгов:** В случае отказа от проведения торгов их организатор в срок не менее чем за пять дней до проведения торгов информирует лиц, подавших заявление об участии в торгах, об отказе от их проведения.

**Отказ участников аукциона от участия в нем:** Участник торгов имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника торгов на аукцион признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Признание торгов несостоявшимися:** Торги признаются несостоявшимися, согласно ст. 127 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.
В случае признания торгов несостоявшимися возможна продажа предмета аукциона единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

**Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов:** Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме не позднее 30 дней со дня проведения торгов в порядке, установленном договором купли-продажи, если иное не предусмотрено собранием (комитетом) кредиторов. Порядок и срок оформления результатов торгов и заключения договора купли-продажи определён ст. 129 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

**Возмещение затрат на организацию и проведение торгов:** Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится победителем торгов по фактическим затратам в течение 3 рабочих дней со дня их проведения при условии представления организатором аукциона документов, подтверждающих сумму фактических затрат.
В случае отказа или уклонения победителя торгов от возмещения затрат на организацию и проведение торгов, их результаты подлежат аннулированию, а внесенный победителем торгов задаток возврату не подлежит и включается в состав имущества продавца.

## Хто каго?

**Як заўжды: можа, анекдот, а можа, і праўда было. Стукае хтось у вароты раю. Апостал Пётр, перш чым адчыніць, абачліва пытаецца:**
**— Хто там?**
**— Я, расійскі футбаліст, — чуе ў адказ.**
**— Быць таго не можа!.. А як жа ты ў вароты пацэліў?.. Футбалістам, ну вядома ж, крыўдна такое чуць.**
**Як і хакеістам, баскетбалістам...**
**Папракаюць, здараецца, іншых спартсменаў...**
**— А вось нас чамусьці не, — заўважыў біятланіст, закідваючы на плечы стрэльбу.**

# «У ВАЕННЫМ ГАРАДКУ МАЛА МЕСЦАЎ У САДКУ...»



Адчуваеце, куды вецер дзьме? Так-так: з аднаго боку — на чарговым конкурсным здымку вайскоўцы, і пажартаваць з іх самы час, здавалася б, а з другога — як бы чаго не выйшла, бо людзі ж пры зброі. Карацей, мае рацыю адзін з нашых чытачоў: «Жывеш і ўсё жыццё баішся, / Бы прадчуваеш — быць бядзе...»

Цьфу-цьфу-цьфу... А зрэшты, няйначай яна побач яна, бо з чаго б гэтыя хлопцы так «кіпці рвуць»? Гляньце на здымак (і «пачуйце» — ад **спадара Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна**.)

*Ад няшчасця, ад бяды*
*Пруць наперагонкі:*
*Бо салагам страх — «дзяды»,*
*Афіцэрам — жонкі.*

Яны, ці вам казаць, і сапраўды могуць з нічога зрабіць абед, прычоску і скандал, лёгка выносяць смецце і мозг — асабліва мужам:

*Прачуханцаў дасць штодня,*
*Калі штось не зробіцца...*
*Старшыня ці старшыня —*
*Ды якая розніца?!*

І галоўнае — часцяком — было б з-за чаго? Падумаеш —

*Затрымаўся на дзве ночкі*
*У каханкі на Калядкі.*
*Жонка выперла ўпрочкі:*
*Вон, мужык, і без аглядкі!..*
*А з нажытага — дык трасы:*
*Усё змясцілася ў калясы.*

Крыўдна за чалавека (у прыватнасці **спадару Міколу Кісялю з Мінска**), баліць душа, але ж гэта, прабачце, яшчэ не спіна... Хоць магла б і яна, прычым — у абодвух герояў, калі б (згадаеце мелодыю?)...

*Цешча хлопцаў гнала*
*Ды жалезным прутам,*
*Бо жонак, дзетак мала*
*Гэтым баламутам!*

Перапеў — ад **спадарыні Галіны Пятроўскай з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна.**

Хоць, магчыма, наконт баламутаў яна і памылілася, бо героі здымка, як мяркуе **спадарыня Любоў Чыгрынава з вёскі Забалацце, што на Вілейшчыне**, зусім не такія: яны пра жонак і дзяцей сваіх дбаюць.

А хто дбае, той, як вядома, і мае:

*Пруць маёр і капітан*
*Па сямейны капітал,*
*Бо цяпер жа ёсць указ...*
*(Немаўляткі — на паказ).*

Трэба разумець, замест розных папрак — у якасці доказаў? І, адпаведна, з надзеяй.

Менавіта яна, гэтая надзея (паводле спадара **Сцяпана Нефідовіча з вёскі Любань Лунінецкага раёна**), іх і прыспешвае:

*У банк шыбуюць*
*з дзецьмі таты —*
*Атрымаць сертыфікаты...*
*Час, як муха, праляціць,*
*Грошай будзе — не злічыць!*

Дай Бог пачутае ды ўбачыць, хоць праз 18 гадоў, бо сем'ям з дзеткамі і сапраўды трэба падкінуць таго капіталу, дапамагчы з жыллём, з працай...

Не менш актуальную праблему згледзеў на здымку **спадар Мікалай Старых з Гомеля**:

*У іх ваенным гарадку*
*Мала месцаў у садку...*
*Зранку ў бацькаў*
*марш-кідок —*
*У суседні гарадок.*

Што, вядома ж, «напружна», як цяпер кажа моладзь! І не толькі для бацькаў... Але ж карысць таксама ёсць (на думку **спадарыні Марыі Грышчанкі з Дзяржынска**):

*Таты сёння рана ўсталі,*
*У марш-кідку ўдзел узялі.*
*Няхай ведаюць сынкі,*
*Што такое марш-кідкі:*
*Афіцэр той... І мужык!*

Мужык, трэба разумець, сапраўдны?! І нішто чалавечае яму не чужое?

*Там, за лесам, будуць песні,*
*Жонкі, у лазеньцы палок...*
*Засталося — годна здзейсніць*
*Толькі гэты марш-кідок, —*

піша **спадарыня Таццяна Петрачэнка з Мінска.** З таго ж канверта — вельмі «тонкі» намёк, што канкрэтна трэба разумець пад «гэтым кідком»:

*Сёння ў нашых жонак шопінг.*
*Дык гайда дамоў хутчэй,*
*Каб без іх прыняць свой «допінг»!*
*Здаць бы некаму дзяцей...*

Каму — ведаюць **сужэнцы Астроўскія з Мінска:**

*Для вайскоўца —*
*гэта шчасце,*
*Калі жонка з ім у часці.*
*А калі паблізу й мама,*
*Дзеткам шчасцейка таксама!*

Ну сапраўды: хто ж іх даглядзіць лепш, чым родная бабуля?! А ў ба́цькаў тым часам рукі развязаны: марш-кідок зрабіў (матулі малых падкінуў) і гуляй, Вася, як той казаў:

*Вось якое выйсце*
*Вынайшаў Патап.*
*Па вінцо каб выйсці,*
*Ён каляску — хап!*
*Заадно — суседа*
*Можна засланіць...*
*Будзе ў іх бяседа —*
*Жонкам не «накрыць»!*

Сцвярджае гэта **спадар Мікола Кісель.** А вось чым падобныя бяседы могуць скончыцца, ведае «перапеўчаніца» **спадарыня Галіна Пятроўская** (мелодыю, як падаецца, вы адгадаеце):

*Выйдуць на вуліцу:*
*Ёсць угамон...*
*Але ж, гульнулі —*
*Не іх гарнізон?!*

А значыць, зараз па шпалах, як той казаў...

Чаму з вазкамі? Ніякай загадкі — у прыватнасці для **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў:**

*Салдат кашу з тапара*
*Прыгатуе лоўка:*
*У вазках — не дзетвара...*
*Тару здаць прыйшла пара —*
*Вось і маскіроўка.*

Нічога святога, як казаў герой Карачанцава з фільма «Белыя росы». І таму, вядома ж, мае рацыю **спадарыня Алена Невяровіч з Асіповіч:**

*Хоць вясковец,*
*хоць вайсковец...*
*Сёння цяжка лёс звязаць:*
*Хто прывык здаваць бутэлькі,*
*Той і дзетак можа «здаць».*

Што праўда, тое праўда. Але ж не будзем пра сумнае. Тым больш што ў пошце конкурсу і вясёлага шмат. Напрыклад, ад **спадарыні Любові Чыгрынавай:**

*У гэтай часці — бэбі-бум,*
*А ў казарме, значыць, тлум...*
*Таму Дзіма і Валодзя*
*Шпацыруюць на прыродзе.*

Малайцы, значыць! А ўсё чаму? Таму што ў гэтым ваенным гарадку (як мяркуе **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**) аб'яўлены адмысловы конкурс, праходзяць пастаянныя спаборніцтвы, і на здымку — проста адна з намінацый:

*Гэта званне, што карона —*
*«Лепшы татка гарнізона»...*
*Немаўлятак пакатаць,*
*Верш напамяць прачытаць...*
*Хутка ў дошку цвік забіць,*
*Мігам лямпачку ўкруціць...*
*Жонкі ставілі ўмовы,*
*А мужы — на ўсё гатовы!*

Прыкладна гэткай жа думкі трымаецца і **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч:**

*На тым здымку — усё проста:*
*На правы здаём... бацькоўства.*

А чаму б і не? Цікавая ідэя! І ў каго, на вашу думку, болей шанцаў на тое, каб атрымаць гэты дакумент з першай спробы? Згадка ад **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Лёс у армію пакліча?*
*Гэта, хлопча, не ў турму,*
*Бо год службы — два здабычы:*
*Там навучышся ўсяму!*
*І тады любая праца*
*Будзе лёгкай падавацца:*
*Да мужчынскай, да жаночай —*
*Ты ўмелы, ты ахвочы!*

Анекдот у тэму: іспанец — чалавек, а іспанка — грып; амерыканец — чалавек, а амерыканка — більярд; індзеец — чалавек, а індзейка — птушка: карэец — чалавек, а карэйка — ежа; балгарын — чалавек, а балгарка — інструмент; фін — чалавек, а фінка — нож; паляк — чалавек, а полька — танец; чэхі і в'етнамцы — людзі, а чэшкі і в'етнамкі — абутак... І толькі беларуска — чалавек, а «Беларус» — трактар. Прычым, кажуць, досыць надзейны — часам праверана... А значыць, калі яго «завесці», ёсць шанц — ён выцягне ўсё!.. Нягледзячы на супярэчнасці, пра адну з якіх, прычым тыповую не толькі для арміі, піша **спадар Анатоль Гарачоў.** Ён, дарэчы, служыў, таму ведае, што ў войску гэтак бывае:

*Цябе пакрыўдзяць насамрэч —*
*Заўвагу выкажуць ці злосць...*
*І ты — у душы — паслаў бы... прэч,*
*Але па звычцы кажаш: «Ёсць!»*

І — адпаведна — бяжыш.

Куды? Здагадка ад **спадара Віктара Трайкоўскага з Мінска:**

*Зіма прайшла, а ці была?*
*Хоць месцамі — снег бачны...*
*А што вясна ўжо прыйшла,*
*Мы вельмі ёй удзячны!*
*Быў сакавік... А зараз — май:*
*Дзянькоў багата светлых!*
*То, мужыкі, кулём у гай!*
*Падорым любым кветкі!*

Бо яны, тыя любыя, як ні круці, а варты (не толькі кветак). Ляча і таму, што разам з мужчынамі, з мужамі (паводле **спадара Гарачова**):

*Жывуць і ўсё жыццё баяцца,*
*Бы прадчуваюць — быць бядзе...*
*З малымі дзецьмі — не наспяцца,*
*А падрастуць — дык сон не ідзе!*

(Анекдот да слова: «Ты, унучачка, малайчына, падрасла, — кажа бабуля. — Праз годзік у школку пойдзеш». Дзяўчынка ў адказ: «Эх, бабулечка... Татка мой праўду кажа: умееш ты чалавеку настрой сапсаваць!»).

Мы — не будзем, бо якраз на гэтай ноце і скончым чарговы агляд.

Засталося назваць пераможцаў? Тады нагадаем, што на папярэднім этапе конкурсу чытачы прыдумлялі подпіс да здымка, на якім па́ра (магчыма, сужэнцаў?) у скрыні везла казу, а побач стаяла кабета з роварам. Дык вось. Найлепшыя радкі пра іх, паводле вялікага чытацкага журы, напісалі: **спадары Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, Сцяпан Нефідовіч з Лунінеччыны, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Раіса Васільева з Гомеля, Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, Марыя Кахоцкая з Воранаўшчыны і Ларыса Салей са Скідаля.** Яна (і, дарэчы, адзіная!) у васьмі вершаваных радках напісала пра ўсё, што было на здымку: пра дзеда з бабай, пра казу, суседку, воз, ровар... Варта цытавання:

*Дзед і баба ў воз паселі*
*І — гайда на навасэлле!*
*Конік ведае кірунак,*
*Коза — лепшы падарунак...*
*Ды суседка ім сказала,*
*Што казы цяпер замала:*
*— Каб зяцёк не супіў бровы,*
*Падарыце й гэты ровар.*

Нашы людзі, праўда? Гатовыя не толькі прыпыніцца, з некім пагаманіць ды штосьць параіць, але і — каб чужога зяця парадаваць — свой веласіпед аддаць!

А «Звязда» — адпаведна — свой прыз (у выглядзе падпіскі на газету на трэці квартал), **спадарыні Ларысе Салей**, якая не толькі заўважыла гэтую рысу нацыянальнага характару, але і «агучыла» яе.

Вы таксама хочаце паспрабаваць — заўважаць, агучыць, паўдзельнічаць у конкурсе і выйграць? Тады — пішыце: каротка, трапна, дасціпна, пабеларуску... Здымак, як заўжды, дададзіца. Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.


**Технический администратор доменной зоны БЕЛ УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»**

**сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен из сформированных списков доменных имен для приоритетной регистрации по итогам благотворительных аукционов.**

**Средства от аукциона, кроме стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.**

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне БЕЛ **из сформированных списков** доменных имен для приоритетной регистрации по итогам благотворительных аукционов. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by.

**Дата начала аукциона – 01 июня 2015 г., дата окончания аукциона – 03 июня 2015 г.**

Время начала аукциона – 12.00 часов даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 часов даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by.

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 472 500 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 2 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

**Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by**
**Тел. организатора +375 17 239 57 02.**
**Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.**



**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

